КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 22 (245) ◂ 3 чэрвеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ЯЎГЕНІЯ УС: ДЗІМА ВЫЙДЗЕ**

Стар. 4

**НЕЗАДАВОЛЕНЫЯ "ЛАЙФАМ"**

На інтэрнэт-форумах усё часцей можна пабачыць скаргі на дзеянні мабільнага аператара «Life:)»

Стар. 6

**ЯК ВЫЛІЧЫЦЬ ДЫКТАТАРА**

19 мая ў парыжскім судзе пачалося незвычайнае пасяджэнне па іску малодшай дачкі прэзідэнта Узбекістана Іслама Карымава

Стар. 11

**МАГДАЛЕНА — ДАЧКА ХМАРЫ**

Стар. 14–15

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!
НАДЫШОЎ ЧАС
ПАДПІСКІ НА ДРУГОЕ
ПАЎГОДДЗЕ 2011 Г.
НЕ ПРАПУСЦІЦЕ!**

▸ ЖЫЦЦЁ

# БУДЗЕ ЯШЧЭ ГОРШ

Аксана КОЛБ

**З кожным днём краіна набліжаецца да дэфолту. І пакуль улада запэўнівае, што ўсё будзе добра, вінаваціць ва ўсім знешніх і ўнутраных ворагаў, насельніцтва скупляе валюту, нерухомасць, лядоўні і ўсё тое, што можна ў гэтыя лядоўні пакласці.**

Хтосьці кажа, што мы ўжо даўно скаціліся на дно эканамічнай яміны, хтосьці сцвярджае, што мы толькі на пачатку гэтага шляху. І чым далей, тым будзе горш. У любым выпадку, напэўна, толькі самы адданы прэзідэнцкі электарат яшчэ верыць у беларускі эканамічны цуд. Усе астатнія рыхтуюцца да горшага. Так, згодна апытанню на партале TUT.BY, 39 працэнтаў рэспандэнтаў прагназуюць, што за гэты год цэны вырастуць на 100–500%, 26 працэнтаў апытаных больш аптымістычныя і вераць, што цэны павялічацца толькі на 70–100%. Яшчэ 11 працэнтаў лічаць, што інфляцыя будзе вышэй за 500%. Такім чынам, 76% рэспандэнтаў не вераць у інфляцыйныя прагнозы ўлады (33–39%).

Валютны крызіс і неўтаймаванае падвышэнне коштаў на ўсё, што яшчэ карыстаецца попытам, — толькі пачатак праяўлення сістэмнага крызісу беларускай мадэлі.

Экс-старшыня Нацыянальнага банка Беларусі, прафесар Станіслаў Багданкевіч лічыць, што «некампетэнтнае аўтарытарнае кіраванне эканомікай прывяло напачатку 2011 года да абвальнага разбурэння цывілізаванага валютнага рынка — аднаго з нешматлікіх рэальных дасягненняў улады. Разбурэнне з'явілася следствам нізкай эканамічнай эфектыўнасці, жыцця краіны не па сродках у апошнія гады — за кошт продажу дзяржуласнасці і прыцягнення вонкавых пазык. Бачнасць дабрабыту, бачнасць росту эканомікі забяспечваліся велізарнай крэдытнай экспансіяй, «друкарскім станком» Нацыянальнага банка. У рублёвай рэсурсавай базе банкаўскай сістэмы краіны доля друкарскага станка дасягнула 49%».

Сапраўды, 16 гадоў краіна жыла не па сродках. Адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі, па дадзеных гандлёвага балансу, за студзень-люты 2011 года склала 1 мільярд 967,3 мільёна долараў. За сакавік гэта лічба павялічылася яшчэ амаль на 900 мільёнаў і склала 2,819 мільярда долараў. Такім чынам, штомесяц краіна марнуе амаль на 1 мільярд больш валюты, чым зарабляе. А гэта, па адзнаках Станіслава Багданкевіча, — амаль 25% ВУП (дарэчы, у 2003 годзе доля адмоўнага сальда ў ВУП складала толькі 3%).

Адкуль гэтыя грошы? Доўгія гады ўлады Беларусі вырашалі свае палітычныя праблемы, забяспечваючы сацыяльна-эканамічную стабільнасць за кошт мільярдаў прыбытку ад продажу нафтапрадуктаў. Па розных ацэнках, гэты прыбытак складаў 7–10 мільярдаў долараў у год.

Яшчэ адна крыніца прыбыткаў — знешнія пазыкі. На 1 студзеня 2011 года знешні доўг Беларусі склаў больш за 28 мільярдаў долараў. Гэта някрытычная лічба. Але пытанне ў тым, куды ідуць гэтыя грошы? А яны марнаваліся і марнуюцца на падтрыманне міфу пра сацыяльную стабільнасць. У той час, як асноўныя вытворчыя фонды працягваюць зношвацца (толькі па афіцыйных дадзеных, асноўныя фонды зношаны больш, чым на 80%).




Акрамя таго, валюта марнуецца на рост аб'ёмаў вытворчасці нікому не патрэбных тавараў — зноў жа для падтрымання міфу пра штогадовы эканамічны рост.

Красамоўным прыкладам бесталковага выкарыстання валютных рэсурсаў стала паведамленне старшыні Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці Васіля Максімава пра тое, што Чашнікская папяровая фабрыка «Чырвоная зорка», якая выпускае папяровыя мяшкі, закупляла макулатуру ў Расіі за валюту, каб выключыць прастої абсталявання і людзей.

Увесь гэты час мы праядалі грошы, якія павінны былі ісці на мадэрнізацыю. Вялікія заробкі чыноўнікаў і дэпутатаў, не забяспечаныя канкурэнтным таварам заробкі рабочых і калгаснікаў, лядовыя палацы, дажынкі, шматлікія дзяржпраграммы — аграгарадкі, агратурызм, БРСМ. І ў выніку — насельніцтва не ведае, куды дзець свае нічым не падмацаваныя мільёны, якія з кожным днём усё больш нагадваюць фанцікі ад карамелек.

Рэальныя прыбыткі насельніцтва за чатыры месяца гэтага года скараціліся амаль у два разы. «У снежні мая пенсія была 634 тысячы, — тлумачыць Таццяна П. з Мінска. (На пенсіі яна ўжо 5 гадоў, але па магчымасці знаходзіць розныя падзаробкі). — На гэту пенсію я магла купіць, напрыклад, 210 долараў, ці 80 кілаграмаў грэчкі, 200 кілаграмаў бульбачкі, 30 кілаграмаў мяса, прыкладна 125 бутэлек сланечнікавага алею. А сёння гэта ўжо 100 долараў, 30 кілаграмаў грэчкі, 100 кілаграмаў бульбы, 15 кілаграмаў мяса і 70 бутэлек алею. Так што, як ні круці, за тыя ж грошы я магу купіць усяго ў два разы менш. А кошты ў крамах растуць з кожным днём».

І ніякая пастанова Саўміна пра дадатковы пералік сацыяльна значных тавараў, кошты на якія будуць рэгулявацца дзяржавай (прынятая, дарэчы, 28 мая), сітуацыю з цэнамі не зменіць.

Кіраўнік аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Леанід Заіка лічыць, што «механізм гіперінфляцыі ўжо запушчаны, і самае галоўнае, што нас чакае, рэзкае зніжэнне спажывецкага попыту, таму што насельніцтва ўжо не ў стане на цяперашнім узроўні пенсій і зарплат плаціць па элементарных групах тавараў».

Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў месяц таму запэўніў, што «да сярэдзіны года кошты збалансуюцца і знойдуць сваё раўнаважкае становішча».

З міністрам не згодны сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Віктар Маргелаў: «Інфляцыя будзе расці прыкладна такімі ж тэмпамі, як і цяпер. Штомесяц рэальны рост коштаў складае 10%, калі не вышэй».

Тыя стабілізацыйныя крэдыты, якія ўлада спадзяецца атрымаць ад Расіі і МВФ, пры існуючым узроўні спажывання, сітуацыю не ўратуюць. Па падліках фінансавых аналітыкаў, толькі для таго, каб неяк выправіць сітуацыю, Беларусі патрэбна мінімум 1 мільярд долараў штомесяц. А каб далей развівацца, патрэбны яшчэ 1 мільярд інвестыцый штомесяц. Задача цяжкавыканальная, асабліва калі ўлічыць, што ніякай абяцанай лібералізацыі эканомікі няма. Сітуацыя, верагодна, будзе ўсё больш абвастрацца. Наперадзе — або зварот да незавершаных рынкавых рэформаў першай паловы 1990-х, або лагічнае завяршэнне беларускай мадэлі пераходам, напрыклад, да кубінскага ўзору, або прывязка да расійскага рубля і страта суверэнітэту, або нешта больш кардынальнае.

ЗАЯВА

# АБАМА СУПРАЦЬ ПРЫСУДАЎ

**Прэзідэнт ЗША Барак Абама падпісаў адпаведную заяву з асуджэннем нядаўніх прысудах, якія вынеслі палітычным вязням у Беларусі.**

«Я рашуча асуджаю прысуды апазіцыйным кандыдатам на прэзідэнцкую пасаду ў Беларусі Уладзіміру Някляеву, Андрэю Саннікаву, Віталю Рымашэўскаму, Мікалаю Статкевічу і Дзмітрыю Усу, — гаворыцца ў заяве. — Злучаныя Штаты лічаць палітычнымі вязнямі гэтых і іншых кандыдатаў і мужных актывістаў, арыштаваных і абвінавачаных у час пераследу ў сувязі з падзеямі 19 снежня. Відавочная палітычная матываванасць судовых працэсаў і іх неадпаведнасць нават мінімальным стандартам, уласцівым справядлівай і незалежнай судовай сістэме, азначае для Беларусі вялікі крок назад у сферы дэмакратыі. Мы падзяляем асуджэнне шырокай міжнароднай супольнасцю дзеянняў Аляксандра Лукашэнкі і ўраду Беларусі ў гэтым пытанні.

Кіруючыся нашымі каштоўнасцямі і прынцыпамі, урад Злучаных Штатаў будзе ўводзіць новыя санкцыі ў дачыненні да асобных беларускіх дзяржаўных прадпрыемстваў, у дадатак да санкцый, візавых абмежаванняў і замарожвання актываў, абвешчаных 31 студзеня. Гэтыя меры скіраваныя супраць асобаў, адказных за рэпрэсіі, у прыватнасці Аляксандра Лукашэнкі, а не супраць народа Беларусі. Мы каардынуем дзеянні з іншымі зацікаўленымі ўрадамі, каб з дапамогай рэжыму гнуткіх міжнародных заклікаць да адказнасці беларускіх чыноўнікаў, якія бралі ўдзел у рэпрэсіях. Мы таксама павялічваем нашу падтрымку дэмакратычным рэформам у Беларусі. Мы далучаемся да Еўрапейскага саюза і іншых нашых саюзнікаў і партнёраў у падтрымцы імкнення народа Беларусі жыць у сучасным, дэмакратычным і квітнеючым еўрапейскім грамадстве».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЗАГАД — ДУШЫЦЬ СМІ

Таццяна ШЭЛЕГ

**Вышэйшы гаспадарчы суд адхіліў іск «Нашай нівы» да Міністэрства інфармацыі аб адмене папярэджання. Яно стала падставай для пачатку ліквідацыі газеты.**

Суддзя Алена Маёрава фактычна дала зялёнае святло гэтаму працэсу. Яна вынесла 30 мая рашэнне пакінуць у сіле папярэджанне Міністэрства інфармацыі за артыкул «Дзяўчына знаходзілася пад завалами, кали Лукашэнка ўскладаў кветкі» («НН» № 14 ад 13 красавіка). Аднак «Наша ніва» скарыстаецца яшчэ магчымасцю абскардзіць гэту судовую пастанову ў касацыйнай калегіі Вышэйшага гаспадарчага суда (ВГС).

Міністэрства інфармацыі падала іск у ВГС і аб спыненні выпуску «Народнай волі». Вытворчасць па гэтай справе таксама прыпынена ў сувязі з тым, што газета падала скаргу на вынясенне ёй папярэджання.

Для абедзвюх газет гэта ўжо не першыя папярэджанні ад Міністэрства інфармацыі за год. Паводле арт. 51 п. 2.2. закона «Аб СМІ», вынясенне на працягу года двух і больш папярэджанняў можа пацягнуць за сабой судовае спыненне выпуску СМІ.

Мініінфармацыі адзначыла, што апошняе папярэджанне «Наша ніва» атрымала за распаўсюд «непраўдзівай інфармацыі аб тым, што адна з ахвяраў тэракту 11 красавіка нібыта знаходзілася на станцыі да позняга вечара».

Як патлумачылі журналісты, дзве вартыя даверу крыніцы незалежна адна ад другой пацвердзілі, што Марына Шубіч трапіла з метро ў шпіталь позним вечарам. А лекары і афіцыйныя асобы гэта абвяргаюць. Дзяўчына, паводле запісаў у прыёмным пакоі, была ў бальніцы ўжо а 18.30. На наступны дзень выданне размясціла на сваім сайце і гэту афіцыйную інфармацыю. Аднак міністэрства вырашыла, што першая публікацыя нанесла шкоду грамадскім інтарэсам і дыскрэдытавала органы дзяржаўнай улады.

«Народнай волі» Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджанне за артыкул Святланы Калінкінай «*Говорит и показывает «Геббельс-ТВ»*». Ён прысвечаны выхаду на Першым канале БТ фільма «*Площа. Железом по стеклу*». Па меркаванні міністэрства, газета распаўсюдзіла звесткі, якія не адпавядаюць рэчаіснасці і ганьбяць дзелавую рэпутацыю Белтэлерадыёкампаніі.

«Аўтар, на наш погляд, правёўшы паралелі паміж СМІ дэмакратычнай дзяржавы, якой з'яўляецца Беларусь, і СМІ нацысцкай Германіі, наўмысна мела на мэце зняславіць дзелавую рэпутацыю вядомай тэлерадыёкампаніі», — лічыць афіцыйнае БТ. Іск да рэдакцыі газеты з боку Белтэлерадыёкампаніі Вышэйшы гаспадарчы суд задаволіў 13 красавіка.

«Ясна адно: прынятае палітычнае рашэнне, ёсць заданне ад кіраўніка дзяржавы», — пракаментавала сітуацыю Жана Літвіна, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў. Яна адзначыла, што ў апошніх публічных выказваннях Лукашэнка прадэманстраваў поўную нецярпімасць да незалежных СМІ. «Абсалютна зразумела, што далей усе органы дзяржаўнага кіравання падпарадкаваны выкананню гэтага палітычнага рашэння», — заявіла кіраўнік БАЖ.

ПРАФЕСІЯ

# ПАЧОБУТА ЧАКАЕ СУД

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Крымінальная справа ў дачыненні да журналіста «Газеты Выборчай» Андрэя Пачобута перададзеная ў суд Ленінскага раёна Гродна. Дата яе разгляду пакуль не абвешчана.**



Жонка журналіста Аксана паведаміла, што трымаецца муж бадзёра. У лісце Андрэй напісаў: «З нецярпеннем чакаю суда, думаю, ён будзе вельмі вясёлай і нават камедыйнай падзеяй. Фінал яго, зразумела ж, вядомы, але гэта той выпадак, калі вынік менш важны, чым працэс».

Журналісту прад'яўлена абвінавачанне па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу РБ — 368 (частка 1) — «абраза» і 367 (частка 1) — «паклёп» у адносінах да прэзідэнта. Па першым з іх прадугледжана пакаранне да двух гадоў зняволення, па другім — ад двух да чатырох гадоў.

Крымінальную справу супраць журналіста завёў пракурор Гродзенскай вобласці Віктар Марозаў. Паводле пракуратуры, абразы Лукашэнку Пачобут наносіў на старонках польскай «Газеты Выборчай», сайта «Белорусский партизан» і свайго блога poczobut.livejournal.com на працягу 2010–2011 гадоў. Журналіста затрымалі 6 красавіка і змясцілі ў гродзенскі СІЗА.

Пры спатканні з жонкай Андрэй перадаў усім калегам прывітанні. А ў лісце запытаўся: «Вы, напэўна, за мяне перажываеце? А я перажываю за вас. Ці не запалохаў вас мой пацярпелы? Ці не паламаў? У мяне тут усё ў парадку. У турме як у турме». Пачобут пажадаў паплечнікам удачы, поспехаў і веры.

«Ён просіць нас, каб ягонае знаходжанне ў турме разглядалася як камандзіроўка. Ён кажа, што тое, што з ім адбылося, гэта глупства ў параўнанні з лёсам камандзіраў Арміі Краёвай, якіх НКУС трымала ў беларускіх турмах у 40-я гады мінулага стагоддзя», — сказала Аксана Пачобут.

Сябры Саюза палякаў для дапамогі сям'і перадалі 31 мая грашовыя сродкі. У Пачобутаў двое дзяцей: дачцэ Яне — дзесяць гадоў, сыну Яраславу — крыху больш за год. Андрэй Пачобут з'яўляецца старшынёй Галоўнай рады гэтай арганізацыі, якую ўлады адмаўляюцца рэгістраваць.

Сваё 38-годдзе журналіст адзначыў 16 красавіка за кратамі. «Увогуле, я не занепадаю, нават наадварот, — напісаў ён на волю. — Беларусь «турэмная» мала чым адрозніваецца ад Беларусі «свабоднай». Рэжым ёсць рэжым. І там у вас, і тут у мяне:-) Хіба што тут, у турме, усё яшчэ больш скандэнсавана. З цікавасцю збіраю матэрыял для «пасттурэмнага рэпартажу», хоць з'явіцца яму будзе наканавана праз некалькі гадоў, але будзьце пэўныя, ад гэтага ён не стане менш цікавым. А як вы там?»

«Газета Выборчая» запатрабавала ад уладаў Беларусі вызвалення Андрэя Пачобута. І звярнулася з заклікам дамагацца вызвалення журналіста да міжнародных арганізацый, замежных СМІ і палітыкаў.

P.S. Лісты Андрэю Пачобуту можна дасылаць на адрас: 230023, г. Гродна, вул. Кірава, 1, СІЗА №1.

ПРЭМІЯ

# НЯКЛЯЕЎ АТРЫМАЎ БОГА

Вольга ХВОІН

**Літаратурную прэмію «Гліняны Вялес», якую штогод прысуджаюць за найлепшую кнігу мастацкай літаратуры, уручылі Уладзіміру Някляеву за кнігу «Кон».**



Цырымонія ўзнагароджвання традыцыйна адбываецца ў Полацку, але для Някляева (яму нельга выехаць за межы горада), як некалі і для Славаміра Адамовіча, было зроблена выключэнне. Статуэтку Вялеса, якую зрабіў Генік Лойка, паэт Уладзімір Някляеў атрымаў у мінскім ПЭН-цэнтры.

І тут грымнуў гром...

Заснавальнік прэміі Алесь Аркуш расказаў, што кожны раз падчас уручэння прэміі адбываюцца незвычайныя з'явы — ці навальніца, ці званы на Полацкай Сафіі біць пачынаюць.

Паэт-лаўрэат сказаў, што ўжо адвык ад літаратурных імпрэзаў: то абмежаванне волі, то палітыка. Для літаратуры часу было мала.

— Шчыра скажу — палітыка не зусім мая справа... Калі я стану прэзідэнтам, то напішу заяву на звальненне і звярнуся вось да гэтага Вялеса: «Вялесе, дай мне сілы і натхнення напісаць яшчэ адну паэму!» А гэтую прэмію трэба было б падзяліць з міністрам Куляшовым: калі б кнігі «Алмаз» не ўздумаў даць мне па галаве, то, можа, і не далі б мне гэтую ўзнагароду, — выказаўся Някляеў у сваёй інаўгурацыйнай прамове. — Літаратура і паэзія — гэта рэчы фундаментальныя. Вось, гаварыць, дэмакратыя... Але ў Еўропу без літаратуры і культуры нам ніяк. Літаратура стварыла Беларусь. І ўжо потым гэты міф быў увасоблены ў рэальнасць.

Бонусам Някляеву ўручылі копію крыжа БНР на бел-чырвона-белай стужцы. Алесь Аркуш патлумачыў, што гэта копія крыжа арміі Булак-Балаховіча. І ён мяркуе, што ніхто з заснавальнікаў БНР не быў бы супраць, каб узнагародзіць Някляева за доблесць.

«Гліняны Вялес» — штогадовая літаратурная прэмія, заснаваная ў 1993 годзе сябрамі Таварыства Вольных Літаратараў. Старшыня арганізацыйнага камітэту — Алесь Аркуш. Прысуджаецца за лепшую мастацкую беларускамоўную кнігу года. Лаўрэат атрымлівае сімвалічную ўзнагароду — гліняны стод апекуна мастацтва. Стаць лаўрэатам прэміі можна толькі аднойчы ў жыцці. У шорт-ліст 2010 года ўвайшлі Міхась Андрасюк, Леанід Галубовіч, Уладзімер Някляеў, Юры Станкевіч, Андрэй Хадановіч.

АКЦЫЯ

# ПАДТРЫМКА БЕЛСАТА

**У Мінску і рэгіёнах з'явіліся стэнсілы (насценныя малюнкі) у падтрымку «Белсату»: «Гэта не пакажуць на БТ. Belsat.eu»**

Блогер vandrounik14 змясціў фотаздымкі, зробленыя на мабільны тэлефон. На прыпынках, а таксама пад'ездах — надпісы аранжавага і блакітнага колеру з наступным тэкстам: «Гэта не пакажуць на БТ. www.belsat.eu».

Vandrounik14 адзначае, што некалькі надпісаў ужо прыбралі. І задае рытарычнае пытанне: «Цікава, куды знікае аператыўнасць супрацоўнікаў ЖКГ, калі з'яўляюцца падобныя надпісы з усялякай нецэнзуршчынай? Ці яны прыбіраюць толькі там, дзе ёсць палітычны падтэкст?»

Аўтарства стэнсілаў застаецца невядомае. Стэнсілы з'явіліся ў Зялёным Лузе, Малінаўцы, побач са станцыя метро Пушкінская ў Мінску, у Віцебску і Гомелі.

Блогер Zaff-bet размясціў у сваім блогу здымак налепкі «Белсату», якая, відавочна, ужо некалькі месяцаў вісіць на слупе ў цэнтры Мінску. Тут камунальныя службы аказаліся менш дысцыплінаванымі.

Нагадаем, пасля падзеяў 19 снежня для многіх беларусаў тэлеканал «Белсат» стаў галоўнай крыніцай незалежнай інфармацыі. «Белсат» глядзяць праз спадарожнік ці інтэрнэт амаль мільён беларусаў. У Мінску і рэгіёнах адбываюцца імправізаваныя акцыі ў падтрымку незалежных медыяў, у тым ліку і гэтага тэлеканалу.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПРЫЙШОЎ ПУШНЫ ЗВЯРОК?

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Няўжо сапраўды да Беларусі прыйшоў паўночны пушны звярок пад назвай пясец? Мы ж столькі казалі пра «крыштальны сасуд», пра «беларускую стабільнасць», пра «эканамічны цуд»! І раптам у момант усё гэта абвалілася… Ці можа такое быць?**

Аказваецца, можа. Тое, пра што заяўлялі апазіцыянеры на мінулых (ды і пазамінулых) прэзідэнцкіх выбарах, спраўдзілася. Няма ніякага беларускага цуда. Афіцыйны Мінск звярнуўся ў МВФ па чарговы крэдыт.

«Урад і Нацыянальны банк Беларусі 31 мая накіравалі ў Міжнародны валютны фонд зварот аб прадастаўленні рэспубліцы стабілізацыйнага крэдыту», — гаворыцца ў паведамленні для прэсы, якое распаўсюдзіў урад Беларусі.

«Кансультацыі адносна адпаведнай праграмы дзеяння ўраду і Нацыянальнага банка Беларусі будуць праведзены ў межах місіі Міжнароднага валютнага фонду, праца якой пачынаецца ў Беларусі 1 чэрвеня 2011 года», — гаворыцца ў паведамленні.

«Будуць разгледжаны пытанні цяперашняй эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы, абмеркаваныя захады, якія прымаюцца ўрадам і Нацыянальным банкам, каб стабілізаваць сітуацыю на ўнутраным валютным рынку, а таксама вызначана магчымасць падтрымкі МВФ макраэканамічнай палітыкі, якая праводзіцца ў краіне», — гаворыцца ў паведамленні.

У 2009–2010 гадах Беларусь атрымала пяць траншаў крэдыту МВФ па праграме stand-by. Агульная сума сродкаў, выдзеленых фондам у рамках стабілізацыйнай праграмы, склала каля 3,46 мільярда долараў. Дарэчы, гэтыя крэдыты дагэтуль не выплачаныя.

А тым часам беларусы з гумарам ставяцца да сітуацыі. Невядомыя выклалі ролік на сэрвісе YouTube, які амаль адразу перадралі ўсе незалежныя выданні. Кароткая сутнасць роліка: розныя малюнкі з удзелам пясца з надпісамі кшталту «Вось ты які, поўны пісец», «Я пісец, я прыйшоў да вас!», «Прывітанне. А вось і я!» ды іншымі падобнымі. Самае цікавае, што гукавы шэраг на гэтым роліку — знакамітая песня «Саня застанецца з намі». Можа, у нейкай апрацоўцы, не ведаю, бо арыгінал не чуў. Выбачайце за адсутнасць цікавасці да паліткарэктнай папсы, я даўно ўпадабаў рок-н-рол.

А тым часам, па з'яўленні малога пушнога звярка, — хто б мог падумаць! — Расія заклікае Беларусь да выканання правоў чалавека! Але ў адрозненне ад Еўрасаюза не пагражае ніякімі санкцыямі, заявіў міністр замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў 31 мая ў Маскве па выніках свайго візіту ў Мінск. «Спробы абвінавачаць нас у тым, што мы выказалі салідарнасць з ЕС, не цалкам адлюстроўваюць рэчаіснасць. Мы проста заклікаем да выканання правоў чалавека і міжнародных абавязацельстваў, а санкцый ніякіх мы не ўводзім і не пагражаем новымі, як гэта робіць ЕС. Так што тут розніцу трэба разумець», — сказаў кіраўнік МЗС Расіі.

«Мы не заклікаем Беларусь ні да чаго такога, чаго мы б самі перад сабой не ставілі ў якасці задачы — выкананне міжнародных абавязацельстваў, уключаючы, у тым ліку, забеспячэнне правоў чалавека і асноўных свабодаў», — удакладніў Лаўроў.

Ага, адразу ж! Трэба адрозніваць мову «дыпламатычную», якой суцэльна валодае Лаўроў, і мову «наўпроставаю», якой валодае Лукашэнка. Не далей як 25 мая ў Казахстане Лукашэнка заявіў, што «націзм ідзе з усіх бакоў, раптам задэмакратызаваласся кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі, пачаўся націск». «Ледзь не заявы чую Лаўрова пра захаванне ці то правоў чалавека, ці то дэмакратыі. Сяджу і думаю: хто б гаварыў», — падкрэсліў ён.

А зараз — увага! Па выніках свайго візіту ў Мінск 31 мая ў Маскве Лаўроў заявіў, што Лукашэнка, з якім ён сустракаўся, лічыць бесперспектыўнымі спробы Захаду пасварыць Мінск з Масквой. «Лукашэнка сказаў, што спробы Захаду развярнуць яго на шкоду Расіі асуджаныя на правал. Ён ніколі не будзе нічога рабіць, што б супярэчыла нашаму братняму саюзу», — паведаміў Лаўроў.

Ізноў давайце адрозніваць мову «дыпламатычную» ад «наўпроставай». То бок, Лаўроў, магчыма, перадаў Лукашэнку такі ўльтыматум ад расійскага кіраўніцтва, што Лукашэнка вымушаны быў зрабіць разварот на 180 градусаў, і раптам прызнацца ў шчырай любові і вернасці да Расіі.

Цікава, што было сказана Лаўровым Лукашэнку, калі той раптам так памяняў сваю прынцыповую пазіцыю?

**А тым часам — хто б мог падумаць! — Расія заклікае Беларусь да выканання правоў чалавека! Але ў адрозненне ад Еўрасаюза не пагражае ніякімі санкцыямі**

Аднак… Паглядзім, што гэта зменіць. Бадай што нічога. Па дадзеных на 1 чэрвеня, Беларусь заняла першае месца сярод краін былога СССР па тэмпах росту афіцыйнага курсу долара ЗША да нацыянальнай валюты за студзень — май 2011 года. Пра гэта сведчыць праведзены БелаПАН аналіз курсаў на 31 снежня 2010 года і 31 мая 2011 года.

У пяцёрку краін, дзе долар падаражэў, увайшлі Беларусь з ростам курсу на 65,9% (з 3.000 да 4.977 рублёў), Узбекістан — на 3,9% (з 1.640 да 1.704 сумаў), Арменія — на 3,67% (с 363,44 до 376,78 драма), Таджыкістан — на 3,62% (з 4,4031 да 4,5627 самоні) і Украіна — на 0,11% (з 7,9617 да 7,9706 грыўні). Амерыканская валюта патаннела ў Азербайджане — на 1,07% (з 0,7979 да 0,7894 маната), Казахстане — на 1,46% (са 147,50 да 145,34 тэнге), Кыргызстане — на 3,61% (з 47,0992 да 45,4 сома), Малдове — на 3,95% (з 12,1539 да 11,6737 лея), Грузіі — на 6,04% (з 1,7728 да 1,6658 лары), Эстоніі — на 7,11% (з 0,7484 да 0,6952 еўра), Літве — на 7,36% (з 2,6099 да 2,4177 літа), Расіі — на 7,90% (з 30,4769 да 28,0685 рубля) і Латвіі — на 8,04% (з 0,535 да 0,492 лата).

Курс долара павялічыўся ў Беларусі на 65,9%, і знізіўся ў Кыргызстане 3,61%! Можа, аддаць ім назад Бакіева? Каб мы не выглядалі горш за Кыргызстан? А тое яно так і атрымоўваецца: як толькі Бакіеў атабарыўся ў Беларусі, у нас эканоміка з'ехала ніжэй за Кыргызстан. Можа, гэта Бакіеў прыносіць нам фінансавае няшчасце?

А вось тое, што выклікае больш за эканамічны крызіс жах. За апошнія 10 гадоў колькасць дзяцей у Беларусі знізілася амаль на траціну.

Паводле звестак Белстата, на пачатак 2011 года колькасць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў склала 1.737,4 тыс. чалавек, з якіх 40% — дзеці ва ўзросце да 7 гадоў (695,1 тыс. чалавек), 41,3% — ва ўзросце 7–14 гадоў (718,1 тыс. чалавек), 18,7% — падлеткі ва ўзросце 15–17 гадоў (324,2 тыс. чалавек). У параўнанні з 2000 годам колькасць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў у цэлым па Беларусі зменшылася на 27,4%, а ў сельскай мясцовасці — на 37%.

Мы выміраем. І тут ужо не вінаваты ніякі Бакіеў.

Чаму толькі за 10 гадоў колькасць дзяцей скарацілася на траціну? Хто прымаў праграму па падтрымцы маладых сем'яў, і чаму, насуперак праграме, нараджальнасць крытычна падае? Задумайся пра гэта, спадарства.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЯКСАНДР ВАРЛАМАЎ



Вядомаму беларускаму дызайнеру, кіраўніку Цэнтра маладзёжнай моды БДУ, заснавальніку міжнароднага фестывалю «Млын моды» Сашу Варламаву прад'яўлена абвінавачанне па ч. 2 арт. 426 (перавышэнне службовых паўнамоцтваў) і ч. 3 арт. 210 (крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) Крымінальнага кодэкса. Паводле дадзеных МУС, «у перыяд з 2007 года да снежня 2010 года Аляксандр Варламаў з'яўляўся дырэктарам ПУП «Агенцтва моды Сашы Варламава», мастацкім кіраўніком цэнтра сучаснага стылю і моды UNIVERSUM MODELS упраўлення па справах культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на грамадскіх пачатках, а потым начальнікам Цэнтра маладзёжнай моды Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на грамадскіх пачатках».

«Дзейнічаючы незаконна, з карыслівай і іншай асабістай зацікаўленасці, перавышаючы свае службовыя паўнамоцтвы, пры камандзіраванні пад яго кіраўніцтвам беларускіх дэлегацый у краіны Еўропы для правядзення фестывалю-конкурсу «Млын моды» — «Міжнародная маладзёжная творчая майстэрня» прысвоіў грашовыя сродкі, выдзеленыя ўдзельнікам дэлегацый на сутачныя расходы, зрабіў значны ўрон правам і законным інтарэсам грамадзян», — цытуе БелаПАН афіцыйную заяву МУС. У дачыненні да Варламава абраная мера стрымання ў выглядзе зняволення пад варту.

7 мая на цырымоніі закрыцця чарговага фестывалю «Млын моды» Варламаў выступіў са зваротам да Аляксандра Лукашэнкі, папрасіўшы не закрываць фестываль. Ён падкрэсліў, што ніколі не займаўся палітыкай, а толькі дызайнам адзення. У інтэрв'ю газеце «Комсомольская правда» в Белоруссии» мадэльер заявіў: «Я стаміўся ад таго, што мне здрадзілі людзі і дзяржава. Міністэрства адукацыі ўвесь час спрабуе паставіць мяне на месца, не дае ні жыць, ні працаваць. Усе гэтыя гады я займаўся фестывалем толькі таму, што люблю дызайнераў, яны мяне натхняюць, я многаму вучуся ў іх. За апошнія 12 гадоў працы я не атрымаў ні капейкі зарплаты. Але я так больш не магу. Мне няма на што купляць прадукты, няма на што жыць».

У абарону Сашы Варламава выступілі яго вядомыя расійскія калегі.

### ЛЮБОЎ ЧАРКАШЫНА



Чэмпіянат Еўропы па мастацкай гімнастыцы ў Мінску завяршыўся трыумфам беларускай гімнасткі Любові Чаркашынай. У заключны дзень спаборніцтваў ёй не было роўных у практыкаваннях з булавамі і мячом, а ў практыкаваннях са стужкамі яна паднялася на трэцюю прыступку п'едэстала гонару. «Мне было лёгка выступаць, бо падтрымлівалі трыбуны. Я літаральна лётала. Было ўнутранае адчуванне, што я не магу падвесці Беларусь, гледачоў, і гэта мяне вельмі падтрымлівала», — перадае словы паспяховай спартоўкі Інтэрфакс.

Другая вядомая беларуская гімнастка Меліта Станюта заваявала срэбны медаль у камандным першынстве чэмпіянату Еўропы. Яна выйшла ў фінал у практыкаванні з мячом, але дапусціла шэраг памылак і заняла выніковае восьмае месца.

### АНДРЭЙ ТУР



Намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур — гэта добры вястун, надзея змучаных чэргамі, панікай і дэвальвацыяй беларусаў. Праз чатыры дні пасля «апускання» беларускага рубля спадар Тур заявіў, што не выключае да канца года рэвальвацыі — павышэння курса рубля. Эксперт-эканамістам ад такіх заяў зрабілася млосна і зайздросна — вось дзе невычарпальнае мора пазітыву!

«З улікам аператыўных мер, што прымаюцца ва ўсіх сегментах, а таксама з улікам мер, разлічаных на сярэднетэрміновую перспектыву, да канца года не выключаная сітуацыя рэвальвацыі, курс долара можа быць апушчаны», — цытуе Андрэя Тура БелТА. Паводле яго слоў, «рэвальвацыйныя працэсы для нас вельмі і вельмі верагодныя».

Варта нагадаць, што 24 мая афіцыйны курс беларускага рубля да долара за дзень упаў на 56%, а з пачатку года нацвалюта да долара афіцыйна страціла ў цане 64,4%. А калі сыходзіць з катыровак міжбанкаўскага рынку, абясцэньванне беларускага рубля за гэты перыяд склала да 170%.

Дэвальвацыя, ад якой так доўга адхрышчвалася кіраўніцтва краіны, выклікала спажывецкую паніку. Грошы абясцэньваюцца на вачах. І ў такой няпростай сітуацыі застаецца хіба што верыць у рэвальвацыю.

▸ ЛЁС

# Яўгенія Ус: ДЗІМА ВЫЙДЗЕ, І ЎСЁ БУДЗЕ ІНАКШ

Вольга ХВОІН

**Жонка асуджанага экс-кандыдата ў прэзідэнты Дзмітрыя Уса, Яўгенія, публічнасці пазбягае. Не было яе фотаздымкаў на перадвыбарчых улётках экс-кандыдата, не трапляла сямейнае жыццё ў кадры журналістаў. Але прысуд мужу — пяць з паловай гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму — змяніў лад жыцця Яўгеніі. Зараз яна мусіць замяніць мужа і на працы, і дома.**



Яўгенія Ус



Дзмітрый Ус менш як праз тры гадзіны будзе ў кайданках

Мы сустрэліся з Яўгеніяй у працоўным кабінеце Дзмітрыя Уса — ён кіраваў уласнай выдавецкай фірмай. Яўгенія сядзіць за працоўным сталом мужа ў акружэнні пячатак, папераў, сямейных фотаздымкаў. Побач ляжыць ва ўпакоўцы фільтр для вады… Рэчы з жыцця Дзмітрыя.

## Камера люкс

— Лістоў Дзіма, на жаль, не піша. Пасля хваробы яму цяжка пісаць. Адвакат рыхтуе дакументы, каб абскардзіць прысуд. Муж цяпер у СІЗА на Валадарскага, — расказвае апошнія весткі Яўгенія. — Гэта «люкс» па турэмных мерках — тэлевізар, лядоўня, нават унітаз нармальны. Іх чакалі там — камера была падрыхтаваная за тыдзень да суда. Яна разлічана на сем чалавек, а там знаходзяцца пяць. Разам з тым у суседніх камерах па сорак чалавек.

Яўгенія крыху замкнёная, але пра падзеі апошніх месяцаў гаворыць адкрыта. Кажа, што да апошняга спадзявалася, што мужа не аправяць у турму. Хаця нічога добрага ад яго палітычнай дзейнасці не чакала.

— Калі пачыналіся гэтыя суды, увогуле не верылася ў нейкі тэрмін. Па сутнасці з нічога раздулі такую мыльную бурбалку! Але, калі на адным з допытаў сказалі: «Не агаворыш Статкевіча, пойдзеш сам», пачалі задумвацца. І на пасяджэнне, якое адмянілі быццам з-за хваробы суддзі, ішлі з рэчамі, чакалі, што пасадзяць. Але пасля заяваў Лукашэнкі ў Астане я спадзявалася, што адпусцяць, што ўжо супакоіцца ён. Дзіма не верыў у апраўдальны прысуд… Гэта я з палітыкай не вельмі...

За час размовы Яўгенія некалькі разоў паўтарае, што ад палітыкі заўжды была далёка, што не цікавілася ёй і не верыла, быццам кагосьці можна дамагчыся ў краіне праз выбары.

— Мы два гады жанатыя. Мы абсалютна розныя. У яго палітыка ў галаве, а мне гэта ніяк. З сужэнскага абавязку я яму, канешне, дапамагала. Але заўжды была супраць і дэпутацтва, і тым больш прэзідэнцтва. Не ў нашай краіне гэтым займацца. Калі чалавека не пускаюць на пасаду дэпутата, дык няўжо яго нехта дапусціць у прэзідэнты?! Я бачыла, як праходзяць выбары — гэта толькі нервы сабе трапаць і грошы траціць.

Напрыканцы снежня Яўгенія была цяжарная на апошнім тэрміне. Расказвае, што Дзмітрый Ус да апошняга быў упэўнены, што не пойдзе на плошчу. Але потым передумаў. Выступіў караценька на Кастрычніцкай, дайшоў да плошчы Незалежнасці. А па тэлевізару ў гэты час пачалі гаварыць, што ў Доме ўраду б'юць шыбы. Яна патэлефанавала мужу і спытала, што адбываецца. Той сказаў, што нічога — проста стаяць і размаўляюць.

— То бок па тэлебачанню ўжо гаварылі пра гэтыя шыбы, хаця, відаць, яшчэ нічога не здарылася. На пачатку на адзінаццатую ён прыйшоў дадому...

## Незавершаны гештальт

Далёкая ад палітыкі жанчына расказвае, як яе муж у 2010 годзе балатаваўся на мясцовых выбарах, і «быў відавочны факт фальсіфікацый».

— Дзіма памяшаны на дэпутацтве, і, калі б не было фальсіфікацый падчас мясцовых выбараў, ён наўрад ці пайшоў бы ў прэзідэнты. Але ён быў нязручным палітыкам, бо не даваў прыкрываць дзіркі тым, хто хацеў крыху урваць ад бюджэту. Я бачыла, як вялікі стос з яго бюлетэнямі пераклалі ў іншы, ператасавалі — і ў выніку выйграў іншы чалавек. А мне сказалі: "Выведзем з міліцыяй, калі не заткнешся". Вось гэта і падштурхнула яго да ідэі балатавацца ў прэзідэнты, каб унесці папраўкі ў Выбарчы кодэкс. Гэта было яго асноўнай мэтай. Калі Дзмітрый быў дэпутатам, ён быў памочнікам Георгія Таразевіча (дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, з сярэдзіны 1990-х — сябар ЦК Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі), менавіта тады і пазнаёміўся са Статкевічам. Яны мелі сяброўскія адносіны, але на маёй памяці не было сумесных абедаў-вячэраў. Калі і Дзмітрый і Статкевіч вылучылі свае кандыдатуры на пасаду прэзідэнта, ім проста было фінансава выгодна арганізоўваць кампаніі разам. Паездкі, друк улётак — дзяржава выдзеліла мізэр грошай.



Маці Дзмітрыя Уса назвала прысуд сыну палітычнай расправай

У сваім мужы Яўгенія бачыць больш пагрозы для рэжыму Лукашэнкі, чым, напрыклад, у Саннікаве.

— Калі параўноўваць Дзіму і Саннікава, гэта маё меркаванне, ён значна больш небяспечны для Аляксандра Рыгоравіча. Папраўкі ў Выбарчы кодэкс з ініцыятывы мужа істотна парушалі б непахіснасць улады. Плюс — ён незалежны ад улады, ад яе падачак, ён чалавек ад народа. Гэта пасыл бізнэсоўцам. Не важна, сеў Дзіма ці не: рухавік запушчаны. Ён выйдзе — і ўсё будзе інакш.

Жанчына адразу ж развейвае ўсе чуткі наконт здароўя экс-кандыдата ў прэзідэнты.

— Ён раней перанёс цяжкую аперацыю, быў у коме, у яго шэсць разоў спынялася сэрца. Ён вучыўся наноў хадзіць, гаварыць, пісаць. Так, крыху запаволеная маторыка, таму ёсць уражанне нездаровага чалавека. Але ў цэлым ён нармальны, адэкватны. Цяпер ён прасіў перадаць яму фільтр для вады, бо там хлорка на зубах скрыпіць. І я тыдзень хаджу вакол СІЗА, пішу заявы, але мне адпіскі даюць. Думаю, прызвычаіцца, усё наладзіцца! — гэтыя словы Яўгенія вымаўляе з упэўненасцю, найперш для сябе.

Яна спакойна распавядае, што Дзмітрый Ус мог з'ехаць за мяжу, калі быў пад падпіскай аб нявыездзе, "яму прапаноўвалі". Расказвае, як пад вокнамі дзяжурылі людзі ў цывільным.

— Аднойчы я выходзіла і пачула, як у мужчыны ў цывільным спрацавала рацыя: «Выходзіць жонка, Уса пакуль няма». А потым яны зніклі, ці то добра маскіраваліся, ці зняліназіранне, бо спадзяваліся, што збяжыць. Але муж сказаў: «Навошта бегаць мне. Хай збягае той, хто гэта ўсё заварыў».

## Службовы раман

І для Дзмітрыя, і для Яўгеніі гэта другі шлюб, розніца ва ўзросце паміж імі — пятнаццаць гадоў. Іх сям'я — вынік, калі можна так сказаць, «службовага раману». Дзяўчына прыйшла ўладкоўвацца на працу. Але Дзмітрый Ус адмовіў — перадумаў браць сабе памочніка. А праз год патэлефанаваў сам. Яны пачалі кантактаваць, у выніку Яўгенія стала і жонкай, і памочнікам.

У сям'і Уса трое дзяцей. Старэйшаму сыну ад першага шлюбу Дзмітрыя 14 гадоў, дачцэ Яўгеніі ад першага шлюбу — тры з паловай гады, а малодшаму сумеснаму дзіцяці — чатыры месяцы. Немаўляці пра тату пакуль не трэба нічога расказваць, а вось дзяўчынку аберагаюць.

— Дачцэ я кажу, што Дзіма ў камандзіроўцы. Навошта ёй у такім узросце пра гэта ўсё ведаць? Але думаю, што ён хутка вернецца. Магчыма нават, да Новага года ўжо будзе дома.

Супрацоўнікі суперажываюць, крывых позіркаў і перашэптванняў за спінаю, маўляў, увязалася дзеўка ў гісторыю з такім мужам, Яўгенія не чуе і не бачыць.

— Усе ж разумеюць, што Дзіма нічога кепскага не зрабіў. Ён змагаўся за праўду. Мы офісы здаём у арэнду, і нават нашы арандатары прыходзяць і пытаюцца, мо трэба грошы, і гатовыя заплаціць наперад за арэнду. Ніхто ніколі не папракнуў, што ў мяне муж асуджаны. Усе ведаюць — гэта палітычная справа.

Яўгенія гаворыць, што цяжка ёй хутчэй па працы, а не дома. Бо яна вядзе справу мужа, а не ўсё паспела засвоіць, і цяпер многае даводзіцца рабіць навобмацак. Пільных праверак бізнэс пакуль не зведаў, але ў спісе Дзяржкантролю яны быццам бы першыя. Так што да ўсяго гатовыя.

Публічнасці Яўгенія пазбягае, і да звання першай лэдзі таксама не імкнулася.

— Я нават не хацела быць на фотаздымках побач з ім. Публічнасць не дае прасторы для асабістага жыцця. Цяжка, калі кожны крок пад прыцэлам. І калі суды былі, я імкнулася не трапіць у аб'ектыў камеры. Пасля прысуду я не рэагавала ні на што. Цяпер ужо ўсё роўна — мужа пасадзілі, першай лэдзі ўсё адно не быць.

Жанчына блізка не кантактуе і з жонкамі, роднымі іншых фігурантаў «справы 19 снежня». Кажа, што не бачыць сэнсу і плёну ў тым, каб плакаць на плячы адзін у аднаго: «Цяпер у нас графік такі: СІЗА, праца, журналісты».

## Ружы ў палісадніку

— На спатканні Дзіма сказаў, што мы прададзім кватэру і набудзем у Мінску дом. Я хачу, каб было зручна, каб была свая прастора, каб не было чутно суседзяў. Каб ніхто не чуў мае скандалы, бо ніхто ж не святы і ва ўсіх бываюць выбухі эмоцый. І каб ружы пасадзіць, газон. Дзіма паабяцаў, што калі выйдзе, мы з'ездзім у адпачынак. І потым купім свой дом. Нішто не вечнае, аднойчы і гэтаму рэжыму прыйдзе канец. Пакуль я не пазнаёмілася з Дзімам, то палітыкай зусім не цікавілася. Ну, вырасла цана на нешта — і ладна. Машыны не было, кошты на бензін мяне не цікавілі. Гэта цяпер я перад падаражаннем закупіла сто літраў бензіну. Раней было больш проста — іншыя клопаты, іншыя погляды. Гэтая сітуацыя не самая лёгкая, але я не адна. Мне родныя дапамагаюць. Вакол мяне людзі, якія хочуць дапамагчы. На працы з людзьмі мне прасцей. А вось дома адной... Я сплю з Дзімінай майкай, кладу яе побач на падушку...

КАМПАНІЯ

# ЖЫВАТВОРНЫ КРЫЗІС І ЧАС

Вольга ХВОІН

**Апазіцыя павольна адыходзіць ад шокавай тэрапіі ўладаў, зладжанай пасля прэзідэнцкіх выбараў. Па справе аб масавых беспарадках асуджана больш за тры дзясяткі чалавек. Хто застаецца на волі, спрабуюць генераваць новыя планы і праграмы дзейнасці.**




Станіслаў Багданкевіч

Псіхіка чалавека пасля моцна стрэсу патрабуе часу для адаптацыі, падстройкі і прыняцця новых рэалій. Палітыкі — звычайныя людзі. І праз паўгода, нягледзячы на тое, што ўмовы дзейнасці ні на крок не зрушыліся ў лепшы бок, відаць, пачынаюць адыходзіць ад ступару. Палітычная дзейнасць не буяе (зрэшты такімі тэрмінамі даўно апеляваць не даводзіцца), але, падобна кволай травіне, прабіваецца праз укатаны асфальт рэпрэсій. Найперш тыя, хто на свабодзе, апелююць да неабходнасці вызвалення палітвязняў (правіла: не чакаць пакуль па табе зазвоніць звон у дзеянні). Адзінкавыя сустрэчы, сходы, праграмы. Як бы блюзнерскі ні гучала, але крызіс цэлай краіны штурхае да дзейнасці. Як кажуць, назваўся груздом, лезь у кошык.

Экс-кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў ладзіць паказальныя закупы на рынку і сустрэчы з блогерамі, працягвае руку дыялогу тым, хто «біў яго галавой аб бампер». Лідар Беларускай партыі «Справядлівы свет» Сяргей Калякін пераабіраецца старшынёй партыі і заяўляе, што дэмакратычныя сілы разглядаюць варыянты ўдзелу ў парламенцкіх выбарах 2012 года. Эксперты Аб'яднанай грамадзянскай партыі пішуць антыкрызісныя праграмы ўраду. І, вось дзіва, маюць пэўны водгук на сваю дзейнасць.

Праўда, больш дакладна можна пакуль гаварыць пра тое, што ёсць цікаўнасць да сябра партыі, былога кіраўніка Нацбанку, прафесара эканомікі Станіслава Багданкевіча. З ім сустрэўся кіраўнік урада Міхаіл Мясніковіч і нават прапанаваў фармальна-нефармальнае супрацоўніцтва. Прасіў ідэйку для барацьбы з фінансавым абвалам. Багданкевіч ад супрацоўніцтва адмовіўся і прапанаваў прыцягваць маладых спецыялістаў, якіх, на яго думку, і ў дзяржінстытуцыях хапае. Праўда, гэтым спецыялістам бракуе смеласці, адвагі прыняць рашэнні, «нават калі ёсць пагроза адстаўкі». І тут да месца была рэпліка з залі падчас прэс-канферэнцыі Станіслава Антонавіча на гэтую тэму: калі б толькі пагроза адстаўкі, дык жа турмы...

Багданкевіч сказаў, што Мясніковіч звярнуўся да яго як да свайго былога калегі — у пачатку станаўлення суверэннай Беларусі абодва працавалі на высокіх дзяржаўных пасадах. Былы кіраўнік Нацбанку прынёс падрыхтаваную АГП сціслую антыкрызісную праграму, якая ў шэрагу іншых мер прапануе ўраду: вызначыць рыначны курс беларускага рубля для гандлю на валютнай біржы; звярнуцца ў МВФ па крэдыт у 8 мільярдаў долараў (праўда, каб атрымаць гэты крэдыт, трэба спыніць палітычныя рэпрэсіі і ціск на недзяржаўныя СМІ); распрацаваць праграму рэформаў; дамагацца наўпроставых замежных інвестыцыяў, што, адпаведна, вымагае фармавання станоўчага іміджу краіны, бо хто ж панясе свае грошы ў непрадказальную «апошнюю дыктатуру Еўропы».

Даречы, урад Беларусі і Нацыянальны банк 31 мая накіравалі ў Міжнародны валютны фонд зварот аб выдзяленні рэспубліцы стабілізацыйнага крэдыту. Падчас працы місіі будуць разгледжаны пытанні бягучай эканамічнай сітуацыі, абмеркаваныя меры, якія прымаюцца ўрадам і Нацбанкам па стабілізацыі сітуацыі на ўнутраным валютным рынку, а таксама вызначана магчымасць падтрымкі Міжнародным валютным фондам макраэканамічнай палітыкі, якая праводзіцца ў краіне.

Тым часам лідар Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька заявіў, што партыя гатовая распачаць кампанію па адстаўцы палітычнага кіраўніцтва Беларусі, калі ўлады ў бліжэйшы час не будуць рабіць канкрэтны крокаў па выхаду з крызісу.

«У пятніцу (3 чэрвеня — рэд.) мы перадаём ва ўрад, Нацбанк і афіцыйныя прафсаюзы антыкрызісную праграму, распрацаваную экспертнай групай пад кіраўніцтвам Станіслава Багданкевіча. Дэдлайн — месяц. Калі мы не ўбачым сур'ёзных крокаў, а наша праграма так і застанецца як альтэрнатыва, то пачнём кампанію па адстаўцы палітычнага кіраўніцтва Беларусі, у тым ліку і Чырвонага дома (гэта Адміністрацыя прэзідэнта — рэд.)», — паведаміў Лябедзька. Антыкрызісную праграму не будуць накіроўваць у Адміністрацыю прэзідэнта, бо, па словах палітыка, «урад і Нацбанк больш легітымныя, чым адміністрацыя».

«Ёсць магчымасць даказаць, што ўрад — гэта ўрад, Нацбанк — гэта Нацбанк. Калі гэты шанец не рэалізуецца, то мы пачнём кампанію, каб існуючая палітычная каманда сышла з палітычнай арэны Беларусі», — заявіў старшыня партыі АГП.

Цягам бліжэйшых двух тыдняў плануецца правесці фокус-групы з рабочымі, моладдзю, работнікамі бюджэтнай сферы, каб не толькі кіравацца сваімі адчуваннямі ў патрэбах насельніцтва, але і рэальнымі фактамі. «Мы хочам максімальнай эфектыўнасці, а не халастых стрэлаў», — падкрэсліў Анатоль Лябедзька.

ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

# НЕАЧОЛЕНЫ ПРАТЭСТ



Вольга ХВОІН

**Градус настрояў незадаволенасці ў беларускім грамадстве падвышаецца хутчэй, чым на гэта паспяваюць рэагаваць палітыкі. Яны так доўга марылі-гаварылі пра сацыяльны пратэст. І вось пратэст на парозе, людзі наэлектрызаваныя і злыя. Але каму яно трэба?**

Сталіца, якая традыцыйна вылучаецца большай інфармаванасцю, палітызаванасцю, непакорнасцю людзей, ужо адзначылася пачаткам сацыяльных успышак. Пакуль лакальнага характару. Папераджальны тэхнічны страйк на Трактарным заводзе, кухталі міліцыянтам ад раз'ятранага натоўпу жанчын за тое, што паклалі тварам у асфальт мужчыну, які заступіўся за безбілетніка ў аўтобусе. У тэму: буйны інтэрнэтпартал TUT.BY правёў апытанне наконт таго, чым ёсць міліцыя для беларусаў. Дык вось толькі 8,48% апытаных мяркуюць, што гэта абарона і ахова. Амаль пятая частка рэспандэнтаў бачыць у міліцыянтах найперш застрашваючую сілу, і больш за палову — 56,06% — вялізныя расходы дзяржбюджэту. Выглядае на тое, што падараваны не толькі давер да супрацоўнікаў міліцыі, але і ўпэўненасць у мэтазгоднасці іх утрымання.

На вуліцах, у грамадскім транспарце толькі і чутно абрыўкі размоў пра рост коштаў ды галечу. Імклівае збядненне — як з разбегу ў прорву — не праходзіць дарэмна для масавай псіхікі. Так, на футбольным матчы «Белшына» — «Дынама», які праходзіў напрыканцы мая, пасля забітага голу спартоўцы падбеглі да трыбуны сваіх фанатаў. Амапаўы пачалі адганяць фанатаў газам і адштурхоўваць. А адзін ахоўнік парадку нават распыліў балон з газам побач з пяцігадовым хлопчыкам. На што фанаты пачалі скандаваць: «Ненавідзім рэжым!». Відаць, так і мусіць выглядаць народная падтрымка 79,65% выбарцаў.

Разумеючы, што ўсё цяпер трымаецца на парахавой бочцы, улады прэвентыўна спыняюць любыя спробы сабрацца ў адным месцы больш чым утрох. Каталікі са скандалам адстаялі шматгадовую традыцыю ладзіць працэсію Божага Цела па цэнтральных вуліцах сталіцы. Мінгарвыканкам спрабаваў скіраваць шэсце ўзбочнымі вуліцамі, мінімізаваць колькасць прыпынкаў вернікаў для малітвы.

Веласіпедыстам (вось ужо дзе сапраўды пагроза і страх рэжыму) не далі правесці ў сталіцы велапрабег «Крытычная маса», у якім удзельнічала больш за 80 чалавек. Пакатушкі скончыліся для некалькіх чалавек затрыманнямі. «Штраф так давалі: прызнаеш віну — 1 базавая велічыня; не прызнаеш — 3 базавых. Хлопца аднаго пасадзілі да нас у аўтобус, дык той наогул апынуўся на ровары не ў тым месцы, не ў той час. У Цэнтральным РАУС адкаталі пальчыкі, фота ў анфас, профіль. Сказалі: больш за трох чалавек разам не ездзіць. Карацей, лёгка абышліся», — пракаментаваў правядзенне акцыі адзін з яе ўдзельнікаў.

Пра народную «любоў і падтрымку», відавочна, у той ці іншай ступені ведае і кіраўнік краіны. Відаць, гэта і ёсць матывам ягоных абвінавачванняў людзей ва ўсіх бедах Беларусі: і крызіс, і паніку стварылі самі. У пацверджанне гэтай ідэі Аляксандр Лукашэнка, спасылаючыся на закрытае сацапытанне, заявіў, што чвэрць насельніцтва Беларусі вінаваціць сябе ў цяжкай эканамічнай сітуацыі, што склалася ў краіне, і толькі 10% — прэзідэнта. Паводле слоў Лукашэнкі, нашы грамадзяне вінавацяць перш за ўсё кіраўніцтва Нацбанку і асабіста кіраўніка банка Пятра Пракаповіча за дзеянні ці бяздзеянне, якія прывялі да гэтай сітуацыі. «Радуе тое, што ў пратэстных акцыях гатовыя прыняць удзел 3–5%», — супакойваючы электарат заявіў кіраўнік Беларусі.

Аднак у сацыяльных сетках пачалі пладзіцца суполкі з заклікам штодня прыходзіць на цэнтральныя плошчы сваіх гарадоў, каб аднойчы набраць крытычную пратэстную масу. Абмеркаванні сітуацыі ўсё часцей зводзяцца да пытанняў: «Дзе лідары і хто гатовы стаць на чале незадаволеных?» У гэтым святле піяраўскі візіты Уладзіміра Някляева на сталічны рынак ёсць слушным крокам і інструкцыяй да дзеяння ў тым, хто прэтэндуе на лідарства, — народ вас чакае побач з сабой,у сваіх шэрагах. І тым, хто хоча захаваць за сабой статус лідара, давядзецца прымаць гэты выклік-патрэбу грамадства. Інакш нішу Кастуся Каліноўскага могуць заняць нованароджаныя лідары, вакол якіх і аб'ядноўцца падманутыя ў сваіх надзеях беларусы. Як тое здарылася ў Мінску, калі за абаронцу безбілетнага студэнта заступіўся мінак Алег Кудрачоў і быў збіты міліцыянтамі. А натоўп аб'яднаўся, каб адбіць гэтага чалавека ад самаўпраўнасці міліцыі. Гісторыя набыла розгалас, і цягам аднаго дня для кампенсацыі штрафу, выпісанага Алегу, сабралі амаль два мільёны рублёў.

▸ ТЭНДЭНЦЫЯ

# НЕЗАДАВОЛЕНЫЯ «ЛАЙФАМ»

## КАРЫСТАЛЬНІКІ СКАРДЗЯЦЦА НА ПАПУЛЯРНАГА АПЕРАТАРА МАБІЛЬНАЙ СУВЯЗІ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**На інтэрнэт-форумах усё часцей можна пабачыць скаргі на дзеянні мабільнага аператара «Life:)». Многія карыстальнікі незадаволеныя сервісам мабільнага мадэму "3G Life", які «на законных паставах» спісвае вялікую суму з рахунку пры націсканні «не на тую кнопку», а некаторыя наўпрост абвінавачваюць кампанію ў вымагальніцтве ды навязванні паслугаў і адстойваюць сваю пазіцыю праз суд.**

Тэрмін 3G выкарыстоўваецца для апісання сэрвісаў мабільнай сувязі стандарту наступнага (трэцяга) пакалення, якія забяспечваюць больш высокую якасць гуку, а таксама высакахуткасны доступ у інтэрнэт і мультымедыйныя сэрвісы.
(З Беларускай Вікіпэдыі)

Кампанія «Turkcell» увайшла на беларускі рынак у 2008 годзе, перакупіўшы ў ЗАТ «БеСТ» 80% акцый. І адразу ўзяла быка за рогі, запаланіўшы беларускія медыі напорыстай рэкламай свайго брэнду «Life:)» з прапановай самых танных тарыфаў на мабільную сувязь. «Фішкай» новага аператара стаў стандарт — 3G: у адрозненні ад простай мабільнай сувязі, гэтую паслугу кампанія ўвяла з сярэдзіны 2009-га, апярэдзіўшы канкурэнтаў. Прапановы былі самымі зваблівымі — «Life:)» імкліва завяраваў сабе армію аматараў новых тэхналогій. Калі ў студзені 2009 года абанентаў «Life:)» была 231 тысяча, у лістападзе кампанія абвясціла пра лічбу 700 тысяч. Трэба меркаваць, не ў апошнюю чаргу паўмільённы рывок адбыўся, дзякуючы мабільнаму інтэрнэту.

### «Самі вінаватыя!»

«Самі вінаватыя!» Менавіта так грамадскасць рэагуе на лямант абкрадзенага пасажыра, які пакінуў без нагляду багаж на вакзале або даверыў грошы махляру-напарсточніку. Але, здавалася б, усё гэта тычыцца экстраардынарных абставінаў, сітуацыі дарогі, рынку. І тым больш дзіўна, што падобныя эмоцыі і рыторыка могуць тычыцца такой звыклай і бяскрыўднай на сёння рэчы, як мабільная сувязь, якая для многіх стала прадметам першай неабходнасці. «Самі вінаватыя!» — стандартны адказ, які чуюць абураныя карыстальнікі «лайфаўскіх» 3G-мадэмаў, калі «белая флэшка» з'ядае 20, 50 а то і 100 тысяч рублёў за суткі.

Карыстальнік мабільнага інтэрнэту «3G Life:)» — сапёр. Варта памыліцца адзін раз — і ваш бюджэт падарваны. Справа ў тым, што тарыф «3G Life:)» дзейнічае «пакетамі» — новы трафік залічваецца на рахунак раз на месяц. Скажам, напрыканцы месяца ў вас заканчваецца трафік. Вы, як і просіць сістэма з дапамогай смскі, ідзяце ў банк і аплачваеце інтэрнэт на наступны месяц. Дапусцім, гэта тарыф, які абяцае 2 гігабайты за 49 тысяч. Уключаеце інтэрнэт, бачыце на рахунку грошы і вырашаеце, што ўсё ў парадку. Але літаральна праз пару гадзін інтэрнэт знікае. Сістэма паведамляе, што грошай бракуе...

Званок у тэхпадтрымку (дзе, трэба сказаць, рэдка калі бывае свабодная лінія), адкрывае вам вочы: «Вы не дачакаліся смскі пра залічэнне новага трафіку!»

«Чаму ж мадэм мяне ўвогуле выпускае ў сеціва, калі ў мяне яшчэ не актываваная паслуга?» — абураецца мая знаёмая Алена, якая страціла на гэтых смсках каля 120 тысяч за паўгода. Яна лічыць, што гэтая паўза паміж залічэннем грошай і стартам паслугі — пастка для няўважлівых, праз якую кампанія «Life:)» прыўлашчвае грошы. Бо ў кароткі перыяд, калі грошы залічылі, а пакет яшчэ не «распакавалі», 1 мегабайт трафіку каштуе 1000 рублёў. Толькі вось інфармацыі пра такія расцэнкі на сайце кампаніі мы з Аленай як ні шукалі, не знайшлі. Яе прадстаўляе служба тэхпадтрымкі па тэлефоне — вусна.

Пасля размовы з «тэлефоннай паненкай» вам не застаецца нічога іншага, як адчуць сябе адсталым ад прагрэсу, унесці чарговыя 49 тысяч, уключыць кампутар і чакаць смскі. Дарэчы, калі рабіць усё правільна, то можна прасядзець без інтэрнэту і некалькі сутак, і тыдзень. У выніку, вы не кіруеце інтэрнэтам, а наадварот — залежыце ад яго капрызных тарыфаў. Не вельмі мабільны варыянт.

Многія кліенты, зразумеўшы, што карыстацца такім інтэрнэтам ім нязручна, перастаюць плаціць за «3G «Life:)» і закідваюць мадэм на паліцу. І тады праз пэўны час ім прыходзіць заказны ліст з патрабаваннем аплаціць «штраф у памеры 588 тысяч у бясспрэчным парадку». Гэта ўмова гадавога кантракту, які заключае кожны абанент кампаніі пры набыцці тарыфу.

І тут пачынаецца самае цікавае.




### Магчыма ўсё...

Яшчэ задоўга да 2009 года іншыя мабільныя аператары спрабавалі атрымаць ад Міністэрства сувязі ліцэнзію на мабільны інтэрнэт стандарту 3G. Але ўсім кампаніям было адмоўлена. Тое, што ў 2009 годзе гэта ўдалося ЗАТ «БеСТ», выклікала шмат здзіўлення ў шэрагах IT-спецыялістаў і дало нагоду для самых розных чутак і плётак...

Інтэрнэтчыкі пішуць і пра адзінкавыя выпадкі, калі ў суд выклікалі людзей, якія ніколі не набывалі мадэм «3G Life:)». Нехта скарыстаўся копіямі іх пашпартоў, каб заключыць ліпавы кантракт на набыццё мадэму, а потым гаротным прыйшлі штрафы.

«Я нават захварэў на нервовай глебе. Справа нават не ў тым, што для мяне 588 тысяч — вялікія грошы (...) Мяне найбольш абурае сама несправядлівасць, што я павінен за нейкага махляра цярпець, ды яшчэ ў судовых цяжбах удзельнічаць», — піша dj_karapuz.

У маі 2011 года аператар "life":) стаў адзіным інтэрнэт-правайдэрам, які заблакаваў сайты charter97.org і «першы віртуальны абменнік» prokopovi.ch, на якім публікуюцца незалежныя эканамічныя навіны і адбываюцца здзелкі па куплі-продажы валюты.



### «3G — гэта назва тарыфу»

«За мінулы год ЗАТ «БеСТ» спагнала праз суд са сваіх абанентаў 1,5 мільярды рублёў. За што? За прадстаўленую паслугу? Не! Гэтыя людзі не карысталіся мабільным інтэрнэтам! Тады за што яны плацяць?» — задае рытарычныя пытанні Mavetan. У студзені 2011 года гэты жыхар Маладзечна апісаў на форуме onliner.by гісторыю свайго судовага працэсу з мабільнай кампаніяй «Life:)».

У канцы 2009 года, калі паслуга толькі пачала дзейнічаць, «Life:)» прадаваў мадэмы людзям, якія фізічна не маглі імі скарыстацца, бо 3G-сувязі ў іх мясцовасці яшчэ не было. Людзі вярталіся ў сервісны цэнтр праз дзень, але ў разрыве кантракту ім адмаўлялі. Большасць з іх сплаціла штраф у 588 тысяч. Найбольш пацярпелі жыхары вёсак і райцэнтраў. Вось і Mavetan набыў мадэм, які спатрэбіўся яму для выдаленай працы па інтэрнэце. Але дома выявіў, што інтэрнэт працуе ледзь-ледзь — паштовы сэрвер адкрываецца пяць хвілінаў. Між тым, супрацоўніца кампаніі паказвала яму карту пакрыцця і пераконвала, што ў яго раёне ёсць сігнал. Расзлаваны карыстальнік кінуў інтэрнэт у шуфлядку, бо нават падарыць яго нікому не мог — мадэм не працаваў па ўсім Маладзечна. А праз паўгода атрымаў позву ў суд за нясплату. Хлопец не разгубіўся і з дапамогай Таварыства абароны спажыўцоў падаў сустрэчную позву, у якой патрабаваў 40 мільёнаў кампенсацыі за сарваную па віне аператара выдаленую працу.

На судзе выявілася, што мадэм маладзечанцу прадалі 18 лістапада, а кантракт на правядзенне 3G-інтэрнэту ў Маладэчна ЗАТ «БеСТ» заключыла... 19-га лістапада! Запрацаваў жа 3G-інтэрнэт толькі ў студзені 2010 года. «Кампанія «Life:)» будуе сваю абарону на тым, што 3G — гэта не стандарт сувязі, а... назва тарыфу, — кажа Mavetan. — Паводле дамовы, «Life:)» абавязаны прадстаўляць карыстальнікам не сувязь трэцяга пакалення, а стандарт GSM 900/1800. А гэта нават павольней, чым тэлефонны мадэм!»

Гэта значыць, што калі вы купілі "запарожац" з прыкручаным да капота значкам «мэрсэдэсу» па цане «мэрсэдэсу», то вы... Правільна — самі вінаватыя.

У маі 2011 года позву жыхара Маладзечна адхілілі ўжо ў абласным судзе. «Цяпер наша мэта — Вярхоўны суд РБ, — кажа хлопец з нейкай самаіроніяй у голасе. — Але паколькі я прапанаваны, што і там нашу позву не задаволяць, я маю намер звяртацца ў Страсбургскі суд». Па яго звестках, беларускі суд прынцыпова не вырашае пытанне на яго карысць: «Каб не ствараць прэцэдэнту». Бо калі Mavetan пераможа, яшчэ сотні маладзечанцаў, якія купілі мадэм «3G Life:)» напрыканцы 2009 года, могуць запатрабаваць ад мабільнай кампаніі кампенсацыі.

«Кампанія «Life:)» прыйшла ў правільную краіну», — з сумнай іроніяй кажа Крысціна — маладая журналістка, якая ў 2008 годзе страціла 40 у.а. па віне гэтай кампаніі. Схемы, па якіх з людзей спаганяюць грошы, тыповыя, і з імі рэальна змагацца, калі дзейнічаць разам, але падмануты беларусы і не думаюць аб'ядноўвацца, каб абараняць свае спажывецкія правы. Нягледзячы на тое, што, паводле юрыстаў, сам кантракт на паслугу «3G Life:)» супярэчыць беларускаму заканадаўству, за апошнія два гады «Life:)» прайграла толькі адзін судовы працэс. І калі падзяліць «прыбытак» кампаніі «Life:)» у 1,5 мільярды на 588 тысяч (сума штрафу), то гэта 2500 чалавек. Якія, зразумела, самі вінаватыя...

Парады юрыстаў «Як абараніцца ад «Life:)» і «Як разарваць дамову з «Life:)» чытаеш як брашуры «Як кінуць паліць» або «Што рабіць, калі вас прадалі ў сэксуальнае рабства за мяжу». Выснова адна: разарваць хітра складзены кантракт магчыма, але трэба быць гатовым да зацяжной і крывавай бітвы. Таму найлепшы спосаб кінуць паліць — не пачынаць. Найлепшы спосаб выбрацца з турэцкага бардэлю — не трапляць у яго...

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 8 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.15** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**08.40** «Маша і Мядзведзь». Мультфільм.
**08.50** Выпускныя іспыты.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Відэафільм «Падарожжа дрыбінскіх шапавалаў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША).
**13.40** «Невядомая версія». Дак. фільм.
**14.30** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага» (Украіна).
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** Камедыя становішчаў «Вар'яцкія грошы» (ЗША-Германія-Румынія).
**23.50** «Эпоха».
**00.20** «Доктар Хаўс-5». Серыял. 2-я серыя.
**01.20** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Выходжу цябе шукаць».
**22.10** Фільм «Прарок». ЗША, 2007 год.
**23.55** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.10** Камедыйны баявік «Шпіён па суседстве» (ЗША).
**10.55** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.35** Медычныя таямніцы.
**12.10** Медычныя таямніцы +.
**12.30** Жаночая ліга.
**12.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.00** Іранічны дэтэктыў «Цень самурая» («Беларусьфільм»). 3- я серыя.
**15.00** Дакументальны фільм «Знакі лёсу».
**15.35** Мультсерыял (Расія).
**16.05** Пазакласная гадзіна.
**16.20** Фантастычны серыял «Прыгоды Электроніка» (СССР). 2-я серыя.
**17.25** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. 1939 год» (Беларусь).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.25** Фантастычная камедыя «Прышэльцы на гарышчы» (ЗША - Канада).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.30** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы 2012. Адборачны раўнд. Беларусь - Данія.
**00.00** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Спусцела без цябе зямля..». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каханне і расстанне».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Каханне і расстанне».
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі.ru».
**00.00** Прэм'ера. «Сведкі».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.20** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Маска. Цэнтральная акруга».
**23.40** «Сапраўдны італьянец». Дакументальны праект.
**00.30** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Часопіс.
**10.00** Веласпорт. Францыя. 3-і этап.
**10.45, 11.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012.
**12.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012. Агляд.
**13.30** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 2-і.
**14.30, 18.30** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 3-і.
**17.30** Веласпорт. Францыя. 4-ы этап.
**20.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Часопіс.
**21.00** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). 1/2 фіналу.
**22.45, 00.20** Абранае па серадах.
**22.55** Конны спорт. Кубак нацый.
**23.55** Навіны коннага спорту.
**00.00** Гольф. Адкрыты чэмпіянат Нідэрландаў. Жанчыны. Ратэрдам (Нідэрланды).
**00.10** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.15** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.30** Веласпорт. Францыя. 4-ы этап.
**01.45** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 12.55** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 6 серыя.
**07.50, 13.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 40 серыя.
**08.45** МакраФон: «Басовішча-2008», канцэрт лаўрэатаў конкурсу.
**09.10, 14.20** Асабісты капітал.
**09.25, 14.35** Праект «Будучыня».
**09.55, 15.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пасол Спасоўскі», дак. фільм, Польшча.
**10.40** «Ранча», серыял: 5 серыя.
**11.30** Невядомая Беларусь: «Шанц на «Новае жыццё», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Музычныя партызаны», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**15.05** Паляванне на дзівосы.
**16.10** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 16 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 7 серыя.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 9 серыя.
**18.15** «Катынь. Праўда і хлусня пра злачынства», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**19.00** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Героі не нашага часу: «Уладзімір Парфяновіч: звычка перамагаць».
**20.00** На колах.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**21.40** Вагон.
**21.45** «Дэкалог, восем», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**22.45** «Euromaxx».
**23.10** Аб'ектыў.

## 9 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША).
**13.45** Патрабуецца.
**14.00** Шэф-кухар.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага» (Украіна).
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Фанаграма запалу». Меладрама (Расія).
**23.45** «Доктар Хаўс-5». Драматычны серыял (ЗША). 3-я серыя.
**00.40** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Выходжу цябе шукаць». Заключныя серыі.
**23.05** «Мужчынскія прыемнасці».
**00.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Фантастычная камедыя «Прышэльцы на гарышчы» (ЗША - Канада).
**10.35** Дача здароўя.
**11.05** Жансавет.
**11.40** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**12.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.00** Іранічны дэтэктыў «Цень самурая» («Беларусьфільм»). 4-я серыя, заключная.
**14.05** «Батанічны сад». Лірычная меладрама («Беларусьфільм»).
**15.50** Мультсерыял (Расія).
**16.05** Пазакласная гадзіна.
**16.20** Фантастычны серыял «Прыгоды Электроніка» (СССР). 3-я серыя, закл.
**17.25** Дак.-гістарычны серыял «Мяжа. Другая Сусветная вайна». Заключная серыя.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Музычная камедыя «Дыска» (Францыя).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.25** Моладзевы камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**23.00** Час футболу.
**23.30** Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Суседзям уваход забаронены» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Тунгускае нашэсце. 100 гадоў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каханне і расстанне».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Каханне і расстанне».
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі.ru».
**00.00** «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Ліцейны».
**21.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Маска. Цэнтральная акруга».
**23.15** Сёння.
**23.40** Дэтэктыў «За межамі закона».

### EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Кубак нацый (Швейцарыя).
**10.30** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 3-і.
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012. Агляд.
**12.30** Веласпорт. Францыя. 4-ы этап.
**13.30** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 3-і.
**14.30** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 4-ы.
**17.00** Веласпорт. Францыя. 5-ы этап.
**18.30** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 4-ы.
**20.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Часопіс.
**21.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя. Кваліфікацыя.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012. Агляд.
**23.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя. Кваліфікацыя.
**01.00** Веласпорт. Францыя. 5-ы этап.
**02.15** Вось дык так!!.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**07.50** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 9 серыя.
**08.35** Побач з намі.
**08.50** Сальда (эканамічная праграма).
**09.05** Басанож па свеце.
**09.30** На колах.
**10.00** Героі не нашага часу «Уладзімір Парфяновіч: звычка перамагаць».
**10.15** «Катынь. Праўда і хлусня пра злачынства», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**11.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.05** «Ранча», серыял: 6 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 16 серыя.
**12.50** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**13.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**14.00** Побач з намі.
**14.15** На колах.
**14.45** Басанож па свеце.
**15.10** Героі не нашага часу «Уладзімір Парфяновіч: звычка перамагаць».
**15.25** «Катынь. Праўда і хлусня пра злачынства», дак. фільм, 1993 г., Польшча.
**16.10** Сальда (эканамічная праграма).
**16.30** «Euromaxx».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял.
**17.30** «Дэкалог, восем», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**18.25** «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**19.05** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.15** YoLife.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Навігатар.
**20.00** «Euromaxx».
**20.25** Два на два (тэледыскусія):.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**21.40** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**22.30** Рэпартэр.
**23.00** МакраФон: «Рок-карона–2008»: Канцэрт гурта «Ляпіс Трубяцкой».
**23.25** Аб'ектыў.

## 10 ЧЭРВЕНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Наўскач па Еўропах».
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША). Закл. серыі.
**13.50** Патрабуецца.
**14.05** Відэафільм АТН «Святло Міёрскіх зорак» цыклу «Зямля беларуская».
**14.15** «Сінематэка».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Школа доктара Камароўскага» (Украіна).
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Баявік-фэнтэзі «Саламон Кейн» (Вялікабрытанія-Францыя-Чэхія).
**23.40** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**00.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда»(Украіна).
**01.00** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «ДО РЭ: Леанід Агуцін».
**23.05** Фільм «Англійскі пацыент».
**01.55** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** «КВЗ. Першая ліга. 1/4 фіналу».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.45** Фільм «Нар'ега - любімчык бога». ЗША, 2000 г.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Музычная камедыя «Дыска» (Францыя).
**11.00** Час футболу.
**11.30** Кінаспробы.
**11.50** Жывы гук.
**12.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.35** Гаспадар.
**14.05** Конкурс маладых музыкаў «Маладыя таленты Беларусі».
**15.00** Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Суседзям уваход забаронены» (ЗША).
**16.45** Мультсерыял (Расія). Закл. серыі.
**17.15** Пазакласная гадзіна.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.20** Фільм-фэнтэзі «Горад Эмбер» (ЗША).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** Авантурная камедыя «Воблака 9» (ЗША).
**23.45** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.25** «Пра мастацтва».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каханне і расстанне».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** Фільм «Жаночае сяброўства».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.10** «Асабліва небяспечны!».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.25** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.50** Прэм'ера. «Вялікі зман зроку». Навуковы дэтэктыў.
**22.05** «Нтвшнікі».
**23.05** «Песня для вашага століка».
**00.15** Камедыя «Доўгі ўікэнд».

### EUROSPORT

**09.30** Веласпорт. Францыя. 5-ы этап.
**10.30** Тэніс. Турнір ATP. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 4-ы.
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012. Агляд.
**12.30** Веласпорт. Францыя. 5-ы этап.
**13.30** Тэніс. Турнір ATP. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Дзень 4-ы.
**14.30** Тэніс. Турнір ATP. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**16.30** Веласпорт. Францыя. 6-ы этап.
**18.30** Тэніс. Турнір ATP. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**20.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Часопіс.
**21.00** Тэніс. Турнір ATP. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**22.00** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Фінал.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012. Кваліфікацыя.
**01.00** Скачкі. Штомесячны агляд.
**01.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**02.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Чароўнае дрэва», серыял: 1 серыя.
**07.45** «Гняздо», серыял: 2 серыя.
**08.35** Два на два (тэледыскусія).
**09.10** YoLife!.
**09.25** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.50** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**10.45** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**11.00** «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**11.40** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дэкалог, восем», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**12.55** «Чароўнае дрэва», серыял: 1 серыя.
**13.25** «Гняздо», серыял: 2 серыя.
**14.15** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.40** Два на два (тэледыскусія).
**15.15** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**15.30** YoLife!.
**15.40** «Бульбаны», мультсерыял.
**15.50** «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**16.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял: 1 серыя.
**17.30** «Уладзімір Драбо Камандор», рэпартаж, 2007 г., Беларусь.
**18.00** Форум (ток-шоу): «Не чакай мяне, пенсія!».
**18.35** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Аўтастопам праз Еўропу.
**20.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Дзе ты, Украіна?», дак. фільм, 2008 г., Украіна.
**22.15** «Пітбуль», серыял: 14 серыя.
**23.00** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.10** Аб'ектыў.

## 11 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

---

**06.50** Мультфільмы.
**07.15** Існасць.
**07.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** «Шэф-кухар».
**10.45** «Я не я». Лірычная камедыя (Расія). 3-я серыя.
**12.10** «Нашы суседзі». Камедыя.
**13.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Наўскач па Еўропах».
**13.55** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**14.20** «Час Саюза». Грамадска-палітычнае ток-шоў.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Nota Bene.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы».
**17.45** «Ваша лато».
**18.35** Латарэя «Пяцёрачка».
**18.50** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Беларусь-Ісландыя. Прамая трансляцыя.
**21.00** Панарама.
**21.35** «Месца сустрэчы». Музычна-забаўляльная праграма.
**23.05** «Пляж». Прыгодніцкі фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**01.00** Канцэрт «Легенды Рэтра FM» (2008).

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** Прэм'ера. «Не бойцеся пачынаць з нуля».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** Мультфільм.
**13.20** Камедыя «Дача».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прыгодніцкі фільм «Турэцкі гамбіт».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Маналетэ». Вялікабрытанія-Іспанія, 2007 год.
**22.50** «Пражэктарперысхілтан».
**23.25** «Што? Дзе? Калі?».
**00.30** Фільм «Інтэрдзяўчынка».

---

**06.35** «Анфас».
**06.50** Фільм «Старшыня». СССР, 1964 г.
**09.30** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** Фільм «Злодзеі ў законе». СССР, 1988 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Індзі». Расія - Украіна, 2007 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Спакуса». ЗША - Францыя, 2001 г.
**23.35** Фільм «Сямейная таямніца». Францыя, 2007 г.

---

**07.15** «Сафія Слуцкая. Апошняя з роду Алелькавічаў». Дак. фільм (БТРК).
**07.45** Нашы тэсты.
**08.15** Усё аб бяспецы.
**08.40** Рэальны свет.
**09.15** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.45** Жансавет.
**10.25** Дача здароўя.
**11.05** Тэлебарометр.
**11.10** Фільм-фэнтэзі «Горад Эмбер» (ЗША).
**12.50** Жаночая ліга.
**13.20** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША). 3-я серыя.
**14.15** «Страсці па культуры».
**14.55** «Магія раялю». Музычны форум. Частка 1-я.
**15.55** Гераіка-прыгодніцкі баявік «Русічы».
**17.45** Біяграфічная драма «Эль Грэка» (Грэцыя - Іспанія).
**19.50** Тэлебарометр.
**19.55** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**21.00** КЕНО.
**21.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Данія - Швейцарыя. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.20** Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Беларусь - Румынія.

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Заліў шчасця».
**08.35** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Жаночае сяброўства».
**13.35** Мультфільмы.
**14.00** Весткі.
**14.15** «Пакой смеху».
**15.30** Прэм'ера. «Вялікая сям'я».
**17.15** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Тэлесерыял «Сваты-3».
**00.20** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Выратавальнікі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.15** «Вочная стаўка».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**23.00** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**00.00** Фантастычны трылер «Імга».

### EUROSPORT

**09.30, 15.15, 21.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Часопіс.
**10.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Warm-Up. Францыя.
**11.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Гонка легенд. Францыя.
**12.00** Тэніс. Турнір ATP. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**13.00** Веласпорт. Францыя. 6-ы этап.
**14.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012. Агляд.
**15.45, 21.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя.
**17.15** Веласпорт. Францыя. 7-ы этап.
**19.00** Тэніс. Турнір ATP. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Кубак караля. (Бангкок, Тайланд).
**01.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Машына зменаў», тэлесерыял: 1 серыя.
**07.50** Калыханка для самых маленькіх.
**08.25** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**09.15** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.45** «Дзе ты, Украіна?», дак. фільм, 2008 г., Украіна.
**10.35** «Рок-карона–2008»: Канцэрт гурта «Ляпіс Трубяцкой».
**11.05** Аўтастопам праз Еўропу.
**11.25** «Уладзімір Драбо Камандор», рэпартаж, 2007 г., Беларусь.
**11.55** «Машына зменаў», тэлесерыял: 1 серыя.
**12.25** Калыханка для самых маленькіх.
**13.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**13.10** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**14.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.30** Форум (ток-шоу): «Не чакай мяне, пенсія!».
**15.10** «Познань'56», маст. фільм, 1996 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 17 серыя.
**17.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**18.00** «Дзе ты, Украіна?», дак. фільм, 2008 г., Украіна.
**18.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Англійская для дзяцей.
**19.45** Госць «Белсату».
**20.05** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Беларускія лёсы: «Алег Трусаў».
**21.35** Суботні сеанс: «Вясёлых Калядаў, спадар Лорэнс!», маст. фільм, 1983 г., Вялікабрытанія–Японія.
**23.45** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 2 серыя.
**00.30** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.40** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 12 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### Першы канал

**06.35** Канцэрт «Легенды Рэтра FM» (2008).
**08.20** Дак. фільм «Матухны» (БТРК).
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**10.20** «Культурныя людзі».
**10.55** «Я не я». Лірычная камедыя (Расія). 4-я серыя, заключная.
**12.10** «Хто смяецца апошнім». Камедыя («Беларусьфільм»).
**13.55** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Ведай нашых».
**15.50** «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях». Камедыя (Францыя).
**17.55** Суперлато.
**18.50** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Чэхія-Украіна. Прамая трансляцыя.
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** «Выпадковыя сувязі». Гумарыстычная праграма.
**22.45** «Заяц над безданню». Камедыя (Расія).

### ОНТ

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** Фільм «Вышыня».
**11.35** Фільм «Арол і рэшка».
**13.10** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Людміла Зыкіна. «Я недалюбіла…».
**17.15** Фільм «Тры таполі на Плюшчысе».
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**20.00** Контуры.
**21.05** Фільм «Адмірал».
**23.25** Прэм'ера. «Супердыскатэка 90-х».

### СТВ

**07.00** Фільм «Спакуса». ЗША - Францыя, 2001 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.25** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** Фільм «Шпік пецярбургскай паліцыі». Расія, 1991 г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.25** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Граф Монтэ-Крыста». ЗША - Вялікабрытанія - Ірландыя, 2002 г.
**23.00** «Прафесійны бокс».
**00.05** Фільм «Жыццё пасля яго». Францыя, 2007 г.

### ЛАД

**07.20** «Свет дзіўных сноў, як манускрыпт…» Дакументальны фільм (БТРК).
**07.45** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.25** Героіка-прыгодніцкі баявік «Русічы».
**10.05** Медычныя таямніцы.
**10.40** Медычныя таямніцы +.
**11.00** Бухта капітанаў.
**11.40** «Казка пра Залатога Пеўнічка». Мультфільм.
**12.15** Тэлебарометр.
**12.20** Нашы тэсты.
**12.55** Кінаспробы.
**13.15** «Правы чалавека».
**13.30** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША). 4-я серыя.
**14.25** «Магія раялю». Музычны форум. Частка 2-я.
**15.20** Жаночая ліга.
**15.55** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы 2012. Адборачны раўнд. Расія - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**17.35** «Гаспадар мораў: на краі зямлі». Прыгодніцкі баявік (ЗША).
**19.55** Смешная часіна.
**20.25** «Навіны надвор'я».
**21.00** «Спортлато 5 з 36».
**21.05** КЕНО.
**21.10** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**21.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Іспанія - Англія. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Час футболу. Чэмпіянат Еўропы U-21».
**00.20** Валейбол. Еўраліга. Жанчыны. Беларусь - Румынія.

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Упершыню замужам».
**08.40** Камедыя «Салдат Іван Броўкін».
**10.20** Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
**12.05** Масква. Крэмль. Цырымонія ўручэння Дзяржаўных прэмій Расійскай Федэрацыі.
**13.05** Камедыя «Тры дні ў Маскве».
**14.00** Весткі.
**14.15** Камедыя «Тры дні ў Маскве». Працяг.
**15.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**16.30** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца. Гумарыстычная праграма.
**17.45** Тэлесерыял «Сваты-3».
**20.00** Весткі тыдня.
**20.35** Тэлесерыял «Сваты-3». Працяг.
**22.00** «Расія маладая». Святочны канцэрт.

### НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**14.10** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне». Першае інфармацыйнае шоў.
**21.55** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «Вецер паўночны».
**23.40** «Гульня».

### EUROSPORT

**04.00, 11.00, 14.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Францыя.
**10.30, 16.15** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле-Мана». Часопіс.
**12.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Сан-Марына.
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Сан-Марына. Заезд 1-ы.
**16.30** Веласпорт. Францыя. 8-ы этап.
**18.00** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Фінал.
**19.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Сан-Марына.
**20.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Сан-Марына. Заезд 2-і.
**20.30** Конны спорт. Global Champions Tour. (Каны, Францыя).
**21.45** Мотаспартыўны часопіс.
**22.00** Веласпорт. Францыя. 8-ы этап.
**23.30** Тэніс. Турнір АТР. Квінс (Лондан, Вялікабрытанія). Фінал.
**00.45** Скачкі. Штомесячны агляд.
**01.15** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Сан-Марына.
**01.45** Супербайк. Чэмпіянат свету. Сан-Марына. Заезд 2-і.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 17 серыя.
**08.00** Калыханка для самых маленькіх.
**08.40** Рэпартэр.
**09.05** Еўропа сёння.
**09.35** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 2 серыя.
**10.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.50** Беларускія лёсы: «Алег Трусаў».
**11.05** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.15** Госць «Белсату».
**11.35** «Вясёлых Калядаў, спадар Лорэнс!», маст. фільм, 1983 г., Вялікабрытанія–Японія.
**13.45** «Бульбаны», мультсерыял.
**13.55** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 17 серыя.
**14.40** «Дзе ты, Украіна?», дак. фільм, 2008 г., Украіна.
**15.35** Еўропа сёння.
**16.00** Госць «Белсату».
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.00** Прыватная калекцыя.
**17.25** «Час гонару», серыял: 33 серыя.
**18.10** Чаму дэмакратыя? 2 серыя: «У пошуках рэвалюцыі».
**19.05** Басанож па свеце.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Англійская для дзяцей.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.00** На колах.
**20.25** Вагон.
**20.30** Без рэтушы: «Каліф на гадзіну», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** Фільматэка майстроў: «Выкупленне з Шаўшанку», маст. фільм, 1994 г., ЗША.
**00.15** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма):.
**00.25** Тыдзень у «Аб'ектыве».


## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

| | | | |
|---|---|---|---|
| Счет получателя | 3012741108019 | Лицевой счет | Код 739 |
| УНП* | 190790926 | | |

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня

Всего

Кассир

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

СПРАВА

# ЯК ВЫЛІЧЫЦЬ ДЫКТАТАРА?

Алег НОВІКАЎ

**19 мая ў парыжскім судзе пачалося незвычайнае пасяджэнне па іску малодшай дачкі прэзідэнта Узбекістана Ісалама Карымава. 33-гадовая Лола Карымава-Ціляева абурылася тым, што яе бацьку ў французскай прэсе назвалі «дыктатарам».**



Лола Карымава-Ціляева

Непасрэдна «дыктатарам» Карымава назваў сайт Rue89. Анлайн-выданне размясціла артыкул журналіста Агюстэна Скальбера пад назвай «СНІД: Узбекістан ужывае палітычныя рэпрэсіі, але робіць сябе ў Канах». Артыкул з'явіўся ў той дзень, калі ў рамках штогадовага міжнароднага кінафэсту ў Канах праходзіў дабрачынны вечар «Кіно супраць СНІДу». У ролі фундатара вечарыны выступіла старэйшая дачка прэзідэнта Узбекістана — Гульнара.

Карымава-Ціляева абвінаваціла журналіста ў паклёпе. Цяпер адвакаты патрабуюць ад рэпарцёра 30000 еўра за маральную шкоду.

Судовы іск Карымавай-Ціляевай на першы погляд выглядае дзіўным. Тое, што Карымаў дыктатар, даўно быццам ніхто не аспрэчваў. У спісе «найгоршых дыктатараў планеты», які складаецца амерыканскім часопісам «Parade» з 2002 года, кіраўнік Узбекістана Іслам Карымаў сёння займае 11-е месца. Упершыню ў гэтым спісе ўзбекскі лідар з'явіўся ў 2006 годзе, неўзабаве пасля таго, як быў абвінавачаны ў масавых забойствах у Андзіжане. Тады Карымаў увогуле ўзняўся на пятае месца.

Як паведамляе ўзбекская рэдакцыя радыёстанцыі «Свабода», у мінулым імя Ісалама Карымава ў якасці дыктатара згадвалася ў матэрыялах Дзяржаўнага дэпартамента ЗША, праваабарончых арганізацый, а таксама ў такіх вядомых друкаваных выданнях, як «Spiegel», «Guardian» і інш.

З гэтым згодна грамадская думка. Так, пошук словазлучэння «дыктатар Карымаў» па Яндэксу выдае нам больш 51 тысячы вынікаў; па Google — 42 тысячы старонак. Па дадзеных таго ж Яндэкса, «дыктатарам» назвалі Ісалама Карымава прынамсі 165 афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі.

Праблема, аднак, у іншым. Іслам Карымаў не з'яўляецца дыктатарам у юрыдычным сэнсе. Ні ва Узбекістане, ні ў Францыі такой службовай асобы няма.

Слова «дыктатар» прыйшло да нас са старажытнага Рыма (ад лацінскага «dictator», ад «dicto» — дыктую, прадпісваю). Так звалі надзвычайную службовую асобу, якая прызначалася консуламі па рашэнні сената ў выпадку крайняй небяспекі. Пасада гэта ўводзілася на тэрмін не больш за шэсць месяцаў, а рэальным чыннікам для добраахвотнага падначалення ўсёй рэспублікі аднаму чалавеку магло стаць толькі вядзенне вайны ці неабходнасць падаўлення мяцяжу.

У Рыме V–II стагоддзяў да нашай эры дыктатар валодаў усёй паўнатой дзяржаўнай улады, яму падпарадкоўваліся ўсе службоўцы, уключаючы консулаў. Дыктатару, па сутнасці, дазвалялася рабіць усё, што ён палічыць неабходным, а пасля заканчэння тэрміну паўнамоцтваў ён не мог быць прыцягнуты да адказнасці. На самых ранніх этапах развіцця рымскай рэспублікі на прысуд дыктатара нават нельга было падаць апеляцыю.

Першапачаткова на пасаду дыктатара маглі прызначацца толькі патрыцыі, але з 356 года да н. э. — таксама плебеі. Часам дыктатар абіраўся для выканання якога-небудзь аднаго даручэння, напрыклад, «дыктатар для забівання цвікоў» (рэлігійны рытуал падчас свята). У перыяд позняй рэспублікі, пры Суле і Цэзары, прызначаных дыктатарамі без абмежавання тэрміна (dictator perpetuus), пасада дыктатара набыла манархічны характар.

У Новы час (асабліва з эпохі Французскай рэвалюцыі) гэты тэрмін, пад уплывам класічных рэмінісцэнцый, адраджаецца, азначаючы кіраўніка, які атрымаў неабмежаваную ўладу ў надзвычайнай сітуацыі. Хаця прававой базы гэты інстытут не меў, шмат каго называлі дыктатарамі, прычым нават у пазітыўным сэнсе. Так, дыктатарам называў сябе Джузепе Гарыбальдзі.

Негатыўную афарбоўку слова «дыктатар» набыло толькі ў пачатку XX стагоддзя дзякуючы Генры Клэю, спікеру амерыканскага Кангрэса. Ён праславіўся аўтарытарным стылем вядзення сесій, за што набыў у прэсе мянушку «дыктатар».

Карымаў — не рымскі грамадзянін, не быў прызначаны сенатам Рыма на пасаду «дыктатара», і, значыць, назваць дыктатарам яго фармальна нельга. Так што вердыкт на першы погляд мае быць вынесены супраць журналіста.

Аднак адвакаты Агюстэна Скальбера лічаць, што шансы ў іх нядрэнныя, каб выйграць працэс. Яны збіраюцца будаваць сваю пазіцыю на спасылкі на слоўнікі. Большасць сучасных слоўнікаў сцвярджае, у нашы часы слова «дыктатар» ужываецца ў іншым значэнні, чым было ў старажытнасці. Пераважна яно азначае «асобу, якая карыстаецца неабмежаванай уладай у кіраванні дзяржавай». Калі ў раннюю рымскую эпоху дыктатараў абмяжоўвалі часавыя рамкі (да прыкладу, адзін генерал быў усяго дыктатарам Рыма ўсяго шаснаццаць дзён), то сёння, ужываючы гэта слова, мы найперш маем на ўвазе кіраўнікоў, якія карыстаюцца неабмежаванай уладай.

**Карымаў — не рымскі грамадзянін, не быў прызначаны сенатам Рыма на пасаду «дыктатара», і, значыць, назваць дыктатарам яго фармальна нельга**



Іслам Карымаў

У гэтым плане Карымаў падпадае пад такую дэфініцыю. Іслам Карымаў кіруе краінай з 1989 года. Пры гэтым, як лічаць яго палітычныя супернікі, ён ужо некалькі разоў парушыў канстытуцыю ўласнай краіны, займаючы вышэйшую службовую пасаду больш за два тэрміны запар.

Праўда, фармальна ў краіне дзейнічае ўрад, законы прымае абраны народам двухпалатны парламент. Аднак на самай справе толькі чалавек, зусім далёкі ад сярэднеазіяцкіх рэалій, не ведае, што ўрадавыя ўказы і пастановы ў большасці выпадкаў дагэтуль падпісвае асабіста прэзідэнт краіны, а заканадаўчы орган — не больш чым марыянеткавы орган, паслухмяны выканаўца інструкцый кіраўніка дзяржавы.

«Яшчэ адна акалічнасць, — піша Lenta.Ru, — якая дазваляе залічыць Карымава ў дыктатары, — гэта прыняцце ў 2003 годзе закона, паводле якога прэзідэнт і яго сям'я вызваляюцца ад якіх бы там ні было судовых пераследаў за ўсе іх дзеянні».

Чым бы ні закончыўся суд, наўрад ці афіцыйнаму Ташкенту ён пойдзе на карысць. Нават дылетанту зразумела, што ў імкненні даказаць сваю праву французскія журналісты стануць казаць і пра крывавае здушэнне беспарадкаў у Андзіжане, і пра адмову Узбекістана ад правядзення незалежнага міжнароднага расследавання тых падзей, пра рабскую працу дзяцей на палях бавоўны, пра пераследы іншадумцаў, поўную забарону палітычнай апазіцыі, татальную цэнзуру і катаванні…Такім чынам, разгляд справы здольны пазнаёміць публіку з фактамі, якія яшчэ больш дыскрэдытуюць лідэра Узбекістана.

У гэтым плане некаторыя выданні задаюцца пытаннем, чым увогуле думала дачка Карымава, калі ішла ў суд? У пошуках адказу міжволі прыходзіш да высновы, што яна думала, нібыта судовая сістэма ў Францыі лялечная, як на яе радзіме. Займець такі светапогляд можна выключна ў краіне, дзе суд мае сімвалічную незалежнасць. Іншымі словамі, у краіне з дыктатарскай мадэллю.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Зрэшты, сапраўды не ў грошах шчасце. Яны ў любым выпадку прыходзяць і сыходзяць. Рэформы патрэбныя былі, каб краіна не засталася так, як ёсць. Стратнай, прыгнечанай і сумнай. Але Лукашэнку, падобна, менавіта такі расклад цяпер і патрэбны. У іншым выпадку, ён наўрад ці пайшоў бы на чарговае абвастрэнне з Масквой. Звычка — другая натура. Гэта зразумела. Але ж павінна быць яшчэ і першая неабходнасць. А яна цяпер заключаецца ў тым, каб выратаваць Беларусь. Як гэта збіраецца рабіць Лукашэнка, ужо не разумее ніхто.

**«Независимая газета» (Расія)**

Больш за ўсё ўлады баяцца спынення прадпрыемстваў і сацыяльнага выбуху. Беларусь — зборачны цэх, які робіць прадукцыю з таго, што ўвозіць. Валюты на закуп камплектуючых у заводаў усё менш. Калі яна скончыцца, заводы стануць. Спачатку гэта будуць вядучыя прадпрыемствы. Гіганты накшталт МАЗа, МТЗ, БелАЗа. Мінск будзе падтрымліваць іх да апошняга — ён і цяпер фактычна датуе іх, забяспечваючы доларамі і расійскімі рублямі па курсе Нацбанка.

**«Русский репортер» (Расія)**

Паставіць эканоміку «на ваенныя рэйкі», «араць, вырабляць і прадаваць», «у трохдзённы тэрмін трэба навесці парадак у коштах і з асартыментам тавараў на паліцах», — вось і ўся рынкавая мера ад Лукашэнкі. За выходныя дні стабілізацыя на спажывецкім рынку Мінску забяспечана. Ніякіх ваганняў коштаў на тавары і паслугі няма, абвясціў стабілізацыю мэр Мінска Мікалай Ладуцька. Кажучы пра такую «стабілізацыю», беларусы звычайна змяняюць у слове суфікс.

**«Республика» (Казахстан)**

«Молодость моя, Белоруссия», — вось гэта праўда. Беларусь — гэта Расія студзеня 1992 года. Шокавыя адчуванні тыя ж. Але наступствы будуць зусім іншыя. Беларусь вырашыла правесці гайдараўскую рэформу без Гайдара і без рэформы.

**Gazeta.ru (Расія)**

Беларусь паўтарае сцэнар Украіны ў 1993–1994 года, калі эканоміка была ў стане абвалу. І наступствы цяперашняга абвалу ў Беларусі будуць для краіны падобныя — актыўна пачне развівацца ценявы сектар, паўстануць дзікія рынкі. І гэта будзе працягвацца, пакуль народ не адчуе хоць нейкую стабільнасць.

**«Kiev Post» (Украіна)**

Казахстанскім студэнтам Лукашэнка прызнаўся, як нялёгка быць прэзідэнтам. Спаць даводзіцца па 4–5 гадзін з тэлефонам пад падушкай: а раптам вайна? Да поўдня выслухвае даклады, праглядае тэлевізійныя навіны і газеты. Гэта значыць, паўдня яму распавядаюць пра тое, што здарылася ўчора. Што скажа беларускі Бацька, калі зараз яго назавуць чалавекам учорашняга дня?

**«Тенге» (Казахстан)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### АЗЕРБАЙДЖАН. НАСІЦЬ БАРОДЫ ЗАБАРОНЕНА

Цікавы метад барацьбы з радыкальным ісламізмам прыдумалі ў Баку. У якасці ціску на набожных мусульман ім гвалтоўна голяць бароды. Выпадкі гвалтоўнага згольвання барады былі зафіксаваныя праваабаронцамі як мінімум у 5 раёнах Азербайджана. Працэс галення, па словах пацярпелых, суправаджаўся жорсткім збіццём і здзекамі кшталту: «А без барады вам больш пасуе». На думку паліцыі, наяўнасць барады звязаная з прыналежнасцю або сімпатыямі да радыкальных ісламскіх груп. Незалежная прэса піша, што ўсё прасцей. Радыкальны ісламізм карыстаецца асаблівай папулярнасцю сярод моладзі, якая сутыкнулася з паўсядзённай галечай, гвалтам дзяржавы. Паколькі ў Азербайджане пануе аўтарытарызм, пратэст часта набывае не палітычныя, а сімвалічныя формы — напрыклад, нашэнне барады. Аднак афіцыёз мае рацыю ў тым, што часам сімвалічныя пратэсты выходзяць за рамкі. На поўначы Азербайджана актывізуецца і абшчына харыджытаў, якія адкрыта кажуць, што не прызнаюць легітымнасць цяперашняга ўрада краіны.

**По матэрыялах казахскай прэсы**

### НІДЭРЛАНДЫ. МАРЫХУАНАВЫЯ ПАШПАРТЫ

Урад Нідэрландаў выступіў з незвычайная ініцыятывай. У выпадку яе падтрымкі ў парламенце, зменіцца сістэма працы так званых кафэ-шопаў — устаноў, дзе кліенты могуць ужываць лёгкія наркотыкі, у прыватнасці марыхуану і гашыш. Ёсць ідэя перавесці ўсе 670 дзеючых у краіне кафэ-шопаў у фармат зачыненых клубаў і прадаваць марыхуану выключна яго сябрам. Тыя сябры будуць мець спецыяльныя пасведчанні — так званыя «марыхуанавыя пашпарты». Пры гэтым кафэ-шоп не можа мець больш за 1500 сяброў. Абмежаваная і доза, якую ўладальнік марыхуанавага пашпарту можа набываць штодня. Такім чынам чыноўнікі, па іх словах, нанясуць смяротны ўдар наркатычнаму турызму і крыміналу, які круціцца вакол кафэ-шопаў. Між тым, апазіцыя скептычна ставіцца да ідэі, баючыся, што сітуацыяй скарыстаюцца нелегальныя дылеры. Сапраўды, забаўка з кафэ-шопамі цікавая толькі для іншаземных турыстаў, якія, у адрозненні ад тубыльцаў, не маюць выхаду на чорны рынак, дзе кошт на траўку на парадак танней. Цяпер турысты стоадсоткава паспрабуюць знайсці гандляроў. Інакш нашто яшчэ прыязджаць у Нідэрланды, адным з турыстычных сімвалаў якіх з'яўляюцца легальныя наркотыкі?

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### УКРАІНА. РУСКАЯ МОВА СТАЛА ДЗЯРЖАЎНАЙ

Руская мова атрымала статус рэгіянальнай на Луганшчыне. З гэтага часу дзяржслужачыя могуць весці дакументацыю і мець зносіны з грамадзянамі на ўкраінскай і на рускай мовах. Дэпутаты, якія прынялі такое рашэнне, спасылаюцца на Еўрапейскую хартыю рэгіянальных моваў і Канстытуцыю Украіны. А свой крок матывавалі тым, што рэалізавалі на справе адзін пунктаў выбарчай праграмы цяперашняга прэзідэнта Украіны, у якой Януковіч абяцаў надаць рускамоўным у выпадку перамогі гарантыі «свабоднага выкарыстання рускай мовы нароўні з украінскай». Падзеі ў Луганску вельмі цікавыя, паколькі сам Януковіч пра абяцанні наконт дзяржаўнага статусу рускай мовы пасля абрання на пасаду прэзідэнта хуценька забыўся, каб не сварыцца з інтэлігенцыяй.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. 30 ГАДОЎ ГНОМАМ, ЯКІЯ РАЗБУРЫЛІ КАМУНІЗМ



Польская грамадскасць святкуе 30-ю гадавіну стварэння руху «Аранжавая альтэрнатыва», сімвалам якога была выява гному. «Аранжавая альтэрнатыва», напэўна, самая творчая фракцыя польскай апазіцыі. Яна ўзнікла ўлетку 1981 года ў Вроцлаве ў творчых маладзёвых колах. Мэта «Аранжавай альтэрнатывы», лідарам якой быў Маёр (мянушка Вальдэмара Фідрыха), заключалася ў тым, каб выставіць на паказ абсурднасць камуністычных улад, пустэчу іх лозунгаў і ідыятызм адміністрацыйных правіл. Напрыклад, гномы праводзілі масавыя маніфестацыі пад лозунгам «Дапамажы міліцыі — пабі сябе сам» або ўрачыста праводзілі ў апошні шлях туалетную паперу, якая была вялікім дэфіцытам ў часы Ярузельскага. Улады не адразу зразумелі, што адбываецца. Гэта дазволіла «аранжыстам» праводзіць легальныя акцыі, калі на двары стаяла вайсковае становішча. Простыя людзі за адсутнасцю іншых акцый апазіцыі падтрымалі ініцыятывы перформансы, што стварыла сапраўдны культурны феномен. У перформансах альтэрнатывы часам удзельнічала да 10 тысяч чалавек. У другой палове 1980-х рух дасягнуў кульмінацыі. Секцыі «Аранжавай альтэрнатывы» ўзніклі па ўсёй Польшчы і нават у замежжы. Аднак пасля краху камунізму цікавасць публікі да руху знікла. Спробы яго адраджэння поспехаў не мелі, хаця заслугі гному ў барацьбе з камунізмам усе прызнаюць. «Маёр» і іншыя актывісты «Аранжавай альтэрнатывы» атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

СКАНДАЛ

# ВЯЛІКІ СПАКУСНІК

*Алег НОВІКАЎ*

**Французскія феміністкі змагаюцца супраць спроб рэабілітацыі Дамініка Строс-Кана, якога намагаюцца прадставіць як архетып народнай сэксуальнай культуры.**



Дамінік Строс-Кан

Адразу было відавочна, што навіна пра арышт Дамініка Строс-Кана ў Нью-Ёрку за спробу згвалтавання пакаёўкі будзе ўспрынятая неадназначна па той бок акіяну. Французы, вялікія нацыяналісты, у такіх выпадках заўсёды бачаць крамолу, спробу знявагі Grande Nation (Вялікая Нацыя), як яны яшчэ называюць Францыю.

Так і атрымалася — абсалютная большасць грамадзян краіны лічыць, што іх суайчыннік стаў ахвярай нейкай змовы. У іншым выпадку стрэлкі пераводзяць на амерыканскае права, якое не ведае такой катэгорыі, як «інтымнае жыццё». Нарэшце, папулярная думка пра тое, што арыштаваўшы дырэктара Міжнароднага валютнага фонду, Амерыка адпомсціла Францыі за тое, што тая ў свой час дала прытулак кінарэжысёру Раману Паланскаму. Апошняга, як вядома, дасюль хочуць прыцягнуць за згвалтаванне непаўналетняй у далёкім 1974 годзе.

Аднак на агучаных тэзісах дамінікафілы не супакоіліся. Публіцы была прадстаўленая новая арыгінальная версія падзей у Нью-Ёрку: Дамінік Строс-Кан пацярпеў з-за таго, што з'яўляецца прадстаўніком французскай фрывольнай сэксуальнай культуры. Быццам, заляцаючыся да пакаёўкі, ён паступіў, як паступіў бы на яго месцы кожны сапраўдны француз. Праблема палягае ў тым, што дзяўчына аказалася выхаванай на пурытанскіх прынцыпах англа-саксонскай сэксуальнай этыкі. У выніку замест таго, каб фліртаваць з мілым французам, пабегла ў паліцыю — пісаць скаргу.

Адным словам, што дрэннага ў тым, каб кахаць жанчыну? Дый спробы згвалтавання ніякай не было. Папулярны журналіст Жан-Франсуа Кан упэўнены, што банкір папросту аўтаматычна задраў сукенку пакаёўцы. А што яму яшчэ рабіць, калі адпаведна французскаму народнаму стэрэатыпу ўсе мужчыны пасля 50-ці гадоў павінны весці сябе а-ля le grand seducteur (вялікі спакуснік). Акрамя таго ў багатых дамах Парыжу даўно існуе традыцыя le droite de troussage — феадальнае права лапаць пакаёвак за адно месца.

У якасці прыкладаў адразу згадалі эратычныя прыгоды вялікіх французаў. Аказваецца, сярод прэзідэнтаў 5-й рэспублікі толькі яе заснавальнік Шарль дэ Голь не быў фігурантам сэксуальных скандалаў. Яго пераемнік Жорж Пампіду праз жонку быў звязаны з некім Штэфанам Марковічам, які займаўся арганізацыяй сэксуальных оргій для прадстаўнікоў эліт. Калі журналісты зацікавіліся наведвальнікамі салонаў Марковіча, яго знайшлі мёртвым пад Парыжам. Валеры Жыскар д'Эстэну прыпісвалі раман з Сільвіяй Крыстэль — выканаўцай галоўнай ролі ў фільме «Эмануэль».

А пра Франсуа Мітэрана і казаць няма чаго. Ён умудрыўся жыць у дзвюх сем'ях. Акрамя афіцыйнага шлюбу, у яго быў грамадзянскі з жанчынай, якая нарадзіла яму дачку. Прычым грошы на ўтрыманне другой жонкі шлі з касы Елісейскага палацу.

Наступны гаспадар палацу Жак Шырак заляцаўся да славутай італьянскай актрысы Клаўдзіі Кардынале і чамусьці вельмі часта наведваў Японію. Французска-японскае супрацоўніцтва было тут не пры чым. Журналісты падазраюць, што ў прэзідэнта ў Японіі была каханка, аднак пакуль нічога канкрэтнага нарыць не здольныя.

Пра Нікаля Сарказі, цяперашняга прэзідэнта, прэса маўчыць. Традыцыйна лічыцца, што інтымнае жыццё лідара нацыі ў час яго праўлення — цалкам зачыненая тэма. Чапаць яе рызыкоўна. У французскіх законах інтымная сфера вельмі моцна абараняецца. За ўмяшанне ў прыватнае жыццё журналіст можа атрымаць год турмы або 45 тысяч еўра штрафу. Рэдакцыі выдання ў такім выпадку пагражае пазбаўленне ліцэнзіі на 5 гадоў.

Калі б Дамінік у 2014 годзе стаў прэзідэнтам (шансы ў яго былі вельмі добрыя), ён, напэўна, цудоўна працягнуў бы гэтую лінію. Зараз вядома як мінімум пра тры сэксуальныя скандалы, у якіх ён быў замешаны. Акрамя таго, банкір быў сябрам «Chandelles» — элітарнага клуба свінгераў.

Вось такія іх норавы. Прычым гаворка не ідзе выключна пра эліту, якую абараняюць звычайна правыя партыі. У абарону Дамініка ўзняліся таксама левыя. Флагман левай прэсы «Liberation» пытаецца: «Ці патрэбна нам поўная празрыстасць жыцця палітыкаў коштам увядзення грамадскай інквізіцыі?» Замежная прэса нават пісала пра феномен нацыянальнага адзінства супраць англа-саксаў.

Аднак нацыянальнае адзінства аказалася фікцыяй. Супраць ператварэння Дамініка Строс-Кана ў сэксуальнага пакутніка паўсталі жанчыны. 22 мая яны правялі ў Парыжы масавую маніфестацыю супраць прапаганды сэксізму пад соусам абароны народнай традыцыі.

У пракламацыі феміністак гаворыцца: «Мы дакладна не ведаем, што адбылося ў Нью-Ёрку, аднак мы бачым, што адбываецца ў Францыі. Мы сталі сведкамі ўздыму садысцкіх і сэксісцкіх рэфлексаў з боку французскай эліты. Падобныя прамовы ілюструюць, што сэксізм у нашай краіне не мае комплексаў, фактычна з'яўляецца беспакараным. Да ніводнай формы дыскрымінацыі ў нас не ставяцца так талерантна. Падобныя прамовы накіраваныя толькі на адно — каб будучыя ахвяры гвалту не падавалі скаргаў. Мы нагадваем усім, што згвалтаванне і спроба згвалтавання — злачынства».

Феміністкі прыводзяць лічбы: штогод у Францыі ахвярамі згаданага віду злачынства з'яўляюцца 75 тысяч жанчын. З іх толькі дзесяць працэнтаў звяртаюцца ў суды.

Вылазка феміністак трошкі змяніла нацыянальную дыскусію. Упершыню пачалі дыскутаваць наконт праблем сэксуальнага дамагання. Згадалі, што паводле статыстыкі, Францыя — адзін з лідараў у галіне гендэрнага нераўнапраўя ў Еўропе (у парламенце толькі 15 працэнтаў жанчын). У сувязі з ростам інтарэсу да гендэрнай праблематыкі, некаторыя аналітыкі нават пачалі казаць пра новую рэдакцыю феміністычнай рэвалюцыі. Што з гэтага атрымаецца, пакуль цяжка сказаць. Як пажартаваў часопіс «Marianne», калі ўсе ахвяры le droite de troussage пададуць пазывы, давядзецца судзіць амаль усіх менеджэраў і палітыкаў, не кажучы пра тое, што судовая сістэма ў краіне проста ляснецца ад вялізарнай колькасці спраў.

ВЫБАРЫ

# ХТО ПЕРАМОЖА БАРАКА?

Алег НОВІКАЎ

**Нягледзячы на выбух папулярнасці Барака Абамы (следства ліквідацыі Бен Ладэна), рэспубліканцы вераць, што змогуць перамагчы на прэзідэнцкіх выбарах–2012. У чэрвені заканчваецца рэгістрацыя ахвочых стаць кандыдатам ад рэспубліканцаў.**


Дональд Трамп

60 працэнтаў электарату гатовыя галасаваць за Абаму, калі выбары будуць заўтра. Гэта лічба, што была агучаная пасля забойства лідара Аль-Каіды, здавалася, ставіць крыж на амбіцыях рэспубліканцаў вярнуць сябе кіраванне прэзідэнцкай адміністрацыяй. Аднак буйной панікі ў шэрагах партыі сланоў няма. Толькі два кандыдата адмовіліся ад ідэі ўдзелу ў кампаніі за апошні час. Адзін з іх — мільярдэр Дональд Трамп, які праславіўся тым, што абвінавачваў Абаму ў фальсіфікацыі метрыкі. На думку Трампа, Барак Абама не мае права займаць Белы дом, паколькі не нарадзіўся ў Штатах.

Аднак іншых палітыкаў скачок папулярнасці Абамы не вельмі засмуціў.

Па-першае, за год яшчэ ўсё можа здарыцца. Усе памятаюць, што рэйтынг прэзідэнта Джымі Картэра напярэдадні выбараў 1980 года быў таксама высокі. Аднак пасля правалу вызвалення заложнікаў амерыканскага пасольства ў Тэгеране нацыя адвярнулася ад гаранта на карысць Рональда Рэйгана. Такі сцэнар не выключаюць і зараз. Па-другое, палітыка — гэта доўгатэрміновая гульня, дзе дзейнічаюць з разлікам на некалькі гадоў наперад. Нават правал на выбарах гарантуе інтарэс з боку грамадскасці і аднапартыйцаў. Не будзем казаць ужо пра суб'ектыўны фактар — жаданне застацца ў гісторыі або карыстаючыся трыбунай сказаць пра тое, што набалела.

На цяперашні дзень ужо сем чалавек афіцыйна абвясцілі пра намер узяць удзел у выбарах кандыдата ад рэспубліканскай партыі. Самая значная фігура — Ньют Гінгрыч, спікер палаты прадстаўнікоў. Найбольш экзатычная — Фрэд Каргер, палітычны кансультант і гей-актывіст з Каліфорніі.

Аднак відавочна, што жадаючых скласці Абаме канкурэнцыю ў наступным годзе будзе значна больш. У ЗША першым крокам да ўдзелу ў кампаніі лічыцца не фармальная заява пра балаціроўку, а пачатак стварэння выбарчага штабу. Сёння акрамя згаданай вышэй сямёркі выбарчыя штабы фармуюць яшчэ чатыры палітыка. Найбольшую ўвагу выклікае фігура Міта Ромні, былога губернатара штату Масачусетс. Аднак гэтым кола кандыдатаў у кандыдаты наўрад ці абмяжуецца. Яшчэ прыкладна 9 чалавек вагаюцца, ці трэба ім такое шчасце, як удзел у выбарах.

Сярод тых, хто не можа прыняць канчатковае рашэнне, як не дзіўна, такія вядомыя асобы, як былы мэр Нью-Ёрку Рудзі Джуліяні і Сара Пэйлін, лідар кансерватыўнага крыла, заснавальнік руху «Tea Party». Па словах экспертаў, да магчымых фаварытаў на праймерыз можна аднесці дэпутата палаты прадстаўнікоў Мішэль Бачмен, якая блізкая па поглядах да Сары Пэйлін.

Што тычыцца Сары Пэйлін, то абвяшчэння аб пачатку яе кампаніі чакаюць з дня на дзень. Інакш «Баракуда» — палітычная мянушка Сары — не пачала б 27 мая нацыянальны аўтамабільны тур «Yes, Sarah Palin is back». Фармальна ў час падарожжа яна будзе збіраць грошы ў свой фонд «Fundamental Restoration of America». Аднак большасць назіральнікаў не сумняваюцца, што гэта толькі падрыхтоўка да заявы пра старт асабістай кампаніі.

У каго лепшыя шансы перамагчы на праймерыз? На цяперашні момант сярод рэспубліканцаў у топе папулярнасці два палітыка: Сара Пэйлін і Міт Ромні. Усе іншыя пакуль значна адстаюць.

У супрацьстаянні Сары і Міта большасць экспертаў ставіць на апошняга. У вачах грамадства ён не такі адыёзны, як Сара, не палярызуе супольнасць, за яго патэнцыйна можа галасаваць «незалежны» выбаршчык, які і вырашыць у выніку лёс выбараў. Буйныя бізнесмены таксама гатовыя выкласці за Міта грошы. Для інфармацыі — хаця праймерыз у 2008 годзе Міт прайграў, ён сабраў на сваю кампанію больш сродкаў, чым тагачасны кандыдат ад рэспубліканцаў Джон Маккейн.

Да яго слабых момантаў можна аднесці непаслядоўнасць у шматлікіх пытаннях, напрыклад, аборты або кантроль над зброяй. Не дадае Міту пунктаў і прыналежнасць да царквы мармонаў, супраць якіх сярод простых янкі шмат забабонаў. Адпаведна вынікам апытання, якія былі праведзеныя ў 2007 годзе, толькі кожны чацвёрты выбаршчык у краіне быў гатовы аддаць голас за кандыдата — сябра Царквы Ісуса Хрыста Апошніх Дзён. Цікава, што асцярожнасць Ромні тычыцца і яго поглядаў на царкву і яе пастулаты. Так, ён вельмі тактычна тлумачыць тэму палігаміі, якую дапускае мармонская царква. Ромні кажа, што ў XIX стагоддзі такі інстытут быў цалкам прыродны, паколькі ў калоніі мармонаў большасць складалі жанчыны. Аднак сёння, па яго словах, «палігамія — гэта жудасная практыка».

Таксама не зразумела, што рабіць з падыходамі Ромні да рэформы медыцыны — адна з улюбёных тэм Абамы. Прапанаваную Баракам сістэму абавязковага медычнага страхавання Ромні даўно рэалізаваў, калі быў губернатарам. Між тым, менавіта медычная рэформа ў вачах рэспубліканцаў — самае вялікае зло, якое робіць цяперашні прэзідэнт ад дэмакратаў.

У Сары Пэйлін грошай няшмат. Яна нават працуе каментатарам на канале «Fox News». Аднак не факт, што шараговыя прыхільнікі рэспубліканцаў, абіраючы кандыдата, будуць думаць складанымі схемамі пра тое, як прывабіць незалежнага выбаршчыка. Як піша брытанскі «New Stateman»: «Сёння шмат рэспубліканцаў знаходзяцца ў пошуку чараўніка, хто надасць ім энергіі, аб'яднае. І гэта, відавочна, не містэр Ромні. Сара Пэйлін?»

З іншага боку, Сара Пэйлін — гэта фігура, з імем якой звязваюць раскол у партыі паміж базай і кіраўніцтвам. Менавіта на крытыцы істэблішменту Сара Пэйлін зрабіла сябе імя. А ў дадатак атрымала масу ворагаў унутры партыі. Ці падтрымае яе ўся партыя, калі яна пераможа на праймерыз? Эксперты кажуць, што зараз больш за ўсё ў Белым Доме чакаюць абвесткі пра тое, што міс Пэйлін ідзе на выбары. Па разліках дэмакратаў, яна за кошт харызмы і энергетыкі зможа выйграць праймерыз у Міта Ромні. Для Абамы гэта гарантаванае пераабранне на другі тэрмін. Як дэманструюць вынікі апытанняў, толькі 23 працэнта амерыканцаў лічаць, што Сара Пэйлін адпавядае крытэрыям прэзідэнта ЗША.

Першыя рэспубліканскія праймерыз адбудуцца ў штаце Аява ў наступным лютым.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВАДЗІМ БРОЎЦАЎ



Прэм'ер-міністр Паўднёвай Асеціі сапсаваў сабе імідж на пахаванні абхазскага прэзідэнта Сяргея Багапша. У жалобнай кнізе пасольства Абхазіі ў Маскве, дзе развітваліся з Багапшам, Броўцаву давялося пісаць тэкст самастойна, ад рукі. У выніку выпускнік Свярдлоўскага інстытута народнай гаспадаркі ад імя «Призидента ЮО» выказаў «собалезнования» ў сувязі са смерцю «призидента РА». І падпісаўся «примьер министрам». Запіс у кнізе была сфатаграфаваны прэс-службай і апублікавана на сайце пасольства Паўднёвай Асеціі. Блогеры адразу паказалі на відавочныя памылкі. Ляпы Броўцава выклікалі скандал у інтэрнэце: «Прэм'ер-міністру Паўднёвай Асеціі Вадзіму Броўцаву тэрмінова трэба да рэпетытара па роднай рускай мове! Пра якое аднаўленне Паўднёвай Асеціі можа ісці гаворка?». Незадаволеныя і самі паўднёвыя асеціны. «Навошта трэба было з Уралу выпісваць такога дурня? Няўжо ў нас тут мала сваіх беспрацоўных?» Між тым фатаздымак запісу ў жалобнай кнізе пасля публікацыі ў блогах, таямніча знікла з сайта пасольства Паўднёвай Асеціі ў Маскве.

### МАРЫЁ ВАРГАС ЛЬЁСА



Перуанкі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры, адзін з лідараў лібералізму ў Лацінскай Амерыцы, нечакана ўмяшаўся ў перуанскі палітычны працэс. Як вядома, уся краіна чакае вынікаў другога туру прэзідэнцкіх выбараў, у якім спаборнічаюць левы папуліст Аланта Хумала і Кейка Фухіморы — дачка дыктатара Альберта Фухіморы, які сядзіць у турме. Калі Льёса даведаўся імёны кандыдатаў, якія прайшлі ў другі тур, сказаў, што гэта будзе выбар паміж ракам на канчатковай стадыі і СНІДам. Аднак зараз ён, здаецца, перагледзеў сваю пазіцыю. Пісьменнік і яшчэ купка мясцовых літаратараў выдалі маніфест супраць вяртання краіны ў часы Фухіморы. Па іх словах, «праўленне Фухіморы было часам дзяржаўнага крыміналу, пра які нельга забываць». У дадатак сам Льёса разрадзіўся калонкай у іспанскім выданні «El Pais», дзе нечакана для ўсіх заклікаў галасаваць за левага кандыдата. Крок абсалютна нечаканы, паколькі Хумала лічыцца сябрам Уга Чавеса, з якім у Льёсы персанальны канфлікт. Па словах Льёсы, пайсці на такі крок яго прымусіла небяспека рэстаўрацыі дыктатуры клану Фухіморы і легітымізацыя яго злачынстваў. Што да левых забабонаў Хумалы, то, на думку пісьменніка, ён іх пераадолее. Між тым, сітуацыя з выбарамі вельмі не вызначаная. На мінулым тыдні рэйтынг Фухіморы ўпершыню зраўняўся з рэйтынгам Хумалы.

### ВАЛЯНЦІНА МАТВІЕНКА

Мэр Санкт-Пецярбургу можа паўтарыць лёс маскоўскага мэра Юрыя Лужкова, якога адправілі ў адстаўку. Праўда, прычынай адстаўкі на гэты раз стануць не лясныя пажары, а выбары ў Думу, якія адбудуцца ўвосень. Справа ў тым, што Матвіенка вельмі не папулярная фігура ў горадзе, а як лідар мясцовай секцыі «Адзінай Расіі», яна зможа пацягнуць увесь партыйны выбарчы спіс на дно. Згодна з неўскіх адзінаросаў не самыя лепшыя часы. Незалежныя эксперты ацэньваюць іх рэйтынг папулярнасці максімум у 20 працэнтаў. Самыя вялікія скептыкі даюць «Адзінай Расіі» максімум 14 працэнтаў. Яшчэ больш складаная сітуацыя з Валянцінай. Калі верыць дадзеным незалежных даследаванняў, напярэдадні выбараў стаўленне пецярбуржцаў да Матвіенкі нават горш, чым да «Адзінай Расіі» ў цэлым. У сувязі з гэтым перад партыйнымі функцыянерамі паўстала заканамернае пытанне: якую ролю зуляе губернатар як лідар выбарчых спісаў? Як пішуць піцерскія СМІ, мясцовыя адзінаросы схіляюцца ды таго, што Матвіенка хутчэй скампраметуе партыю, аднак у вочы ёй сказаць гэта ўсе баяцца, памятаючы, што кіраваць Піцерам яе паставіў сам Пуцін. Сама Матвіенка жыве ў атачэнні падхалімаў, якія, здаецца, даюць ёй вельмі неадэкватную інфармацыю. Так, на днях бургамістр заявіла, што пад яе кіраўніцтвам «мядзведзі» атрымаюць на выбарах ў Піцеры не менш за 50 працэнтаў.



ШМАТПАКУТНЫЯ КРЫЖЫ

# КРЫЖ РАСПЯТАЙ ГУБЫ

Таццяна УЛАСЕНКА

**9 мая Брэсцкая крэпасць, Хатынь, Лінія Сталіна прымаюць безліч шумлівых турыстаў. Але ў поўнай цішы па ўсёй Беларусі стаяць прывіды знішчаных у Другой сусветнай вайне вёсак, якім варта было б надаць увагу. Бо трагедыю, якая там здарылася, немагчыма даравацць карнікам. Знішчаны былі гэтыя вёскі сумеснымі намаганнямі нацыстаў і савецкіх партызан. Дакладна вядома, што ахвярай такога страшнага злачынства стала вёска Вялікая Губа, якая размяшчалася побач з вядомай усяму свету Хатынню.**



Асвячэнне крыжа ў Вялікай Губе, 22 сакавіка 2009 года



Акцыя ў Хатыні. 22 сакавіка 2009 г.

Калісьці — дванаццаць хат, дванаццаць сем'яў. Але ні коміна, ні падмурка. Нічога не засталося з таго, што б нагадвала пра загубленыя чалавечыя жыцці. Пазначана гэта вёска толькі ў нямецкіх ваенных дакументах, а таксама на польскай мапе 1930-х гадоў. Ветэраны, школьнікі, дзяржаўныя прадстаўнікі тут не ўскладаюць кветак і не запальваюць знічак. Да нядаўняга часу Вялікая Губа была ахутана таямніцай.

У 1970 годзе беларуская пісьменніца Алена Кобец-Філімонава атрымала заказ маскоўскага выдавецтва «Дзіцячай літаратуры» напісаць кніжку для дзяцей пра Хатынь.

«Загадчыца аддзела, башкірка па нацыянальнасці, мне так і сказала: «Пра Хатынь павінны ведаць усе дзеці Савецкага Саюза», — распавядае пісьменніца. — Ім патрэбны быў малады аўтар, які ведаў вайну. Прынамсі, я памятала вайну, бо жыла пад нямецкай акупацыяй у Мінску. Спачатку я адмаўлялася ад прапановы, бо да гэтага пісала казкі для дзяцей. Але мяне запэўнілі, што я здолею напісаць добры твор. Такім творам стала дзіцячая аповесць «Жаўрукі над Хатынню». У ёй я ўпершыню і ўзгадала пра вёсачку Вялікая Губа».

Калі пачалася праца над кнігай, інфармацыі пра Хатынь практычна не было. Пісьменніцы давялося заняцца даследчыцкай дзейнасцю — ехаць на месца, расшукваць і апытваць сведкаў, працаваць у архівах. Так з'явілася магчымасць даведацца пра жудасныя абставіны знішчэння Хатыні, Вялікай Губы, забойства сялян з суседняй вёскі Казыры.

«Тады я не ведала, што ў знішчэнні Губы, Хатыні вінаваты не толькі паліцаі, але і савецкія партызаны», — кажа Алена Кобец-Філімонава.

Кніга «Жаўрукі над Хатынню» выйшла ў 1973 годзе. Але тое, як збіраліся матэрыялы для яе напісання, цяжкасці, з якімі сутыкнулася аўтарка падчас выхаду кнігі ў друк, новая, жывая інфармацыя сведкаў, якую нельга было ставіць у кнігу, — далі падставу напісаць яшчэ адзін твор — дакументальную аповесць «Распятая Хатынь», якая выйшла ў 2005 годзе.

— Звычайна выдадзеным у Маскве кнігам адчыняўся зялёны калідор, — распавядае пісьменніца пра дзіцячую аповесць «Жаўрукі над Хатынню». — Іх друкавалі ў саюзных рэспубліках, перакладалі на розныя мовы, адпраўлялі наклады за мяжу дзеля прапаганды. Але маю кніжку не захацелі друкаваць у Беларусі. Нават пасля таго, як яна была выдадзена ў Маскве. Асабліва шкодзіў мне тагачасны дарэктар музея Вялікай Айчыннай вайны. Па замове маскоўскага выдавецтва ён павінен быў напісаць рэцэнзію на кнігу. А напісаў разгромны матэрыял. Калі рукапіс кнігі быў падрыхтаваны і адасланы на рэцэнзію, былы партызан і тагачасны дарэктар музея Лавецкі ў рэцэнзіі адзначыў (цытата з дакументальнай кнігі «Распятая Хатынь»): «…Для чего, спрашивается, автор на сорока страницах расписывает пребывание партизан в Хатыни? Это, во-первых, даёт пищу всякого рода разговорам, особенно со стороны иностраннных туристов, а также является благодатной почвой для буржуазной пропаганды. Во-вторых, тем самым сводится на нет вся пропагандистская работа по Хатыни. Плана уничтожения «Ост» — как не бывало…»

— Што гэта азначала? — Працягвае пісьменніца. — Партызаны парушалі свой жа загад! Загад Цэнтра не заставацца ў вёсках, каб не рызыкаваць жыццямі мірных грамадзян. І мы можам толькі здагадвацца, колькі беларускага насельніцтва стала ахвярамі з-за іх неабдуманых і цынічных дзеянняў. У Істпарце (Партыйны архіў Інстытута гісторыі партыі ЦК КПБ), дзе я працавала з дакументамі, мяне таксама застрашвалі: «…Если напишите, что в Хатыни были партизаны, мы сделаем всё, чтобы ваша книга не была издана».

Калі Алена Кобец-Філімонава пачала збіраць інфармацыю для кнігі, гісторыкі ўжо працавалі над шасцітомнікам партызанскага руху на Беларусі. Ім было катэгарычна забаронена пісаць пра тое, што 22 сакавіка 1943 года ў Хатыні былі савецкія партызаны. Бо напісаць пра гэта — азначала пацвердзіць віну партызан у хатынскай трагедыі. Дакументальная кніга «Распятая Хатынь» тым і ўнікальная, што ўпершыню распавядае нам пра тое, што ў трагедыі Губы, Хатыні вінаваты не толькі паліцаі, нацысты, але і савецкія партызаны.

Пісьменніца працягвае:

— Рэцэнзентаў не задавальнялі некаторыя іншыя факты, напрыклад, інфармацыя пра Камінскага (Іосіф Камінскі — легендарны хатынец, які па афіцыйнай версіі цудам застаўся жывы пасля спалення вёскі; увекавечаны помнікам «Нескароны чалавек» — выява старога, які трымае на руках забітага хлопчыка). Так, мне стала вядома, што яго зяць быў паліцаем. Дарэчы, шмат хатынскіх сем'яў былі паліцэйскімі. І тады пра гэта нельга было пісаць. А ў прыватных гутарках з жыхарамі мне стала вядома, што паліцэйскіх сем'яў, якія ненавідзелі савецкіх партызан, было шмат — і ў Хатыні, і ў Вялікай Губе, і ў іншых мястэчках. Пазней у кнізе «Распятая Хатынь» я прыводжу гутарку з Камінскім, з якой вынікае, што і ён не добра ставіўся да партызан. Так, Камінскі ў сэрцах спавядаецца, што партызаны, якія прыйшлі ў Хатынь напярэдадні пажару, загадалі зарэзаць яго апошнюю авечку. «Немцы ніколі нічога не забіралі, а партызаны — забіралі!» — скажа ён.

Калі ў 1970-х я пачала апытваць сведкаў, то заўважыла, што хатынцы, жыхары суседніх вёсак, катэгарычна адмаўляюцца распавядаць мне сапраўдную гісторыю знішчэння вёскі. Блыталіся ў фактах, хлусілі, адмоўчваліся. Я зразумела, што іх запалохалі. Але гэта мяне не задавольвала. І я ўпарта працягвала распытваць мясцовых жыхароў. Пазней я высветліла, чаму, напрыклад, другая жонка Іосіфа Камінскага так халадна мяне сустрэла. Не дазваляла яму распавядаць пра той страшны дзень, усяляк перашкаджала гутарцы. Што ж, савецкая прапаганда зрабіла з Камінскага легенду, пакутніка, які выпадкова застаўся ў жывых, вынес мёртвае дзіця на руках, калі палымнела Хатынь. — працягвае Алена Кобец-Філімонава. — Але я даведалася, што Камінскага ў тую ноч не было ў Хатыні. Вярнуўся ён у вёску толькі на наступны дзень пасля трагедыі. Там спалілі яго сям'ю. Менавіта ён данёс на партызан. І партызаны кепска пра яго ўзгадвалі. Таксама стала вядома, што Камінскі быў не адзіным жыхаром Хатыні, які застаўся ў жывых.

Падчас збору інфармацыі пра Хатынь пісьменніцу арыштоўвалі як шпіёнку, чакалі дыверсій з яе боку. А аднойчы спадарыні Алене патэлефанавала жанчына (Алена Кобец-Філімонава папрасіла не называць яе прозвішча) і сказала: «У Вас ёсць сын. Падумайце пра яго!»

— Трагедыя Хатыні пачалася з таго, што паліцаі сагналі на валку лесу 26 сялян з вёскі Казыры. Адбывалася гэта ля вёскі Вялікая Губа. Там жа савецкія партызаны зрабілі засаду. І калі побач праязджаў нямецкі патруль, каб праверыць працу сялян і наладзіць радыёсувязь, партызаны адкрылі па іх агонь. Сяляне сталі ахвярамі кароткага бою. Пасля гэтага савецкія партызаны пайшлі ў Хатынь, а немцы рушылі па іх слядах. Такім чынам, казырчане былі расстраляныя, а лёс хатынцаў ужо быў вырашаны, — распавядае пісьменніца. — Былы камісар атраду «Мсціцель», герой Савецкага Саюзу Іван Цімчук мне распавёў, што гэта вёска стала ахвярай расправы і нацыстаў, і савецкіх партызан. У вёсцы жылі напалову сем'і і тых, і другіх. Па яго словах, аднойчы ўначы ў Губу прыйшлі партызаны і выразалі ўсе сем'і тых, хто служыў у нацыстаў, нават не пашкадавалі і дзяцей. Трупы спалілі. «На наступны дзень немцы (не паліцаі) адпомсцілі гэтак жа» (Цытата з кнігі «Распятая Хатынь»). Спачатку выразалі жыхароў, а потым спалілі хаты. Тое ж самае казаў пра Губу і былы партызан брыгады «Народныя мсціўцы» Васіль Алай. Толькі, па яго словах, у гэтай вёсцы было дзесяць паліцэйскіх хат і дзве партызанскія. Нягледзячы на тое, што інфармацыя розніцца, агульная карціна вымалёўваецца даволі яскравая. У знішчэнні Вялікай Губы, Хатыні, сялян вёскі Казыры вінаваты і тыя і другія.

***

Да нядаўняга часу шматпакутная вёска Вялікая Губа заставалася белай плямай на мапе Беларусі. І пра жудасную трагедыю, якая там разыгралася, практычна ніхто не ведаў. Але 18 сакавіка 2009 года з ініцыятывы старшыні руху салідарнасці «Разам» Вячаслава Сіўчыка, сябры секцыі «Мемарыял» усталявалі на месцы спаленай Губы памятны знак — крыж Ефрасінні Полацкай. 22 сакавіка таго ж года адбылася цырымонія асвячэння крыжа, на якой прысутнічалі вядомыя грамадскія дзеячы, сябры секцыі «Мемарыял». Ганаровым госцем была запрошана на цырымонію пісьменніца Алена Кобец-Філімонава. Асвячаў крыж праваслаўны святар айцец Леанід Акаловіч. Тады падчас акцыі В. Сіўчык заўважыў, што памятны крыж будзе ўсталяваны і на месцы расстрэлу казырчан, а секцыя «Мемарыял» намерана дамагацца ад уладаў узвядзення дастойнага помніка на месцы Вялікай Губы.

З моманту ўсталявання крыжа акцыя па ўшанаванню памяці ахвяр Другой сусветнай вайны стала традцыйнай. 22 сакавіка, у дзень спалення Хатыні, сябры руху салідарнасці «Разам» арганізоўваюць жалобны маршрут у знішчаныя вёскі, дзе ўскладаюць кветкі, запальваюць знічкі, чытаюць малітву.

Пра вёску Вялікая Губа часта даводзіцца чуць такую бязглуздую фразу: «Што ж вы хочаце — была вайна. Расплачвалася мірнае насельніцтва…» Але ж ніхто не даваў гэту вайну нацыстам, ніхто не збіраўся іх апраўдваць! Даўно асуджаны нямецкія карнікі. Калі ж будуць асуджаны злачынствы камуністаў, якія прымалі ўдзел у забойстве сваіх жа грамадзян?

ДЫЯСПАРА

# МАГДАЛЕНА — ДАЧКА ХМАРЫ

Наталля ГАРДЗІЕНКА

**Да прыезду ў Канаду пра гэтую жанчыну я ведала толькі тое, што яна з'яўляецца дачкой Сяргея Хмары, аднаго з самых вядомых і супярэчлівых дзеячаў беларускай паваеннай эміграцыі.**



Магдалена Зіняк. 2011 г.



Сяргей Хмара. 1955 г.




Магіла Сяргея Хмары ў Таронта

Магдалена, маючы даволі высокую пасаду на тэлебачанні, амаль што не кантактуе з беларускім асяродкам, а таму застаецца для суродзічаў чалавекам закрытым і, дзякуючы бацьку, паўлегендарным. І менавіта ад яе залежаў доступ да папераў Сяргея Хмары, што захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Канады. Менавіта праз тыя матэрыялы мы і пазнаёміліся.

## Сяргей Хмара

Беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч са Слоніму Сяргей Хмара (сапр. Сіняк, на эміграцыі Марыян Зіняк, 1905–1992) пачаў працу на беларускай ніве яшчэ ў 1920-х. Менавіта тады ён як сябра ТБШ займаўся стварэннем беларускіх школ, як сябра Беларускай сялянска-работніцкай грамады ствараў яе гурткі на Слонімшчыне, пазней як сакратар пасольскага клуба «Змаганне» ў Пінску спрабаваў заснаваць беларускую гімназію і выдаваць часопіс. Ініцыятываў і працы было шмат, нездарма на адным з судовых працэсаў над Сяргеем Сіняком суддзя назваў яго «лятаючым рыцарам Грамады». За сваю актыўную грамадскую дзейнасць гэты чалавек пры польскай, савецкай і нямецкай уладах агулам адсядзеў каля 11 гадоў, зведаў і Лукішкі, і Картуз-Бярозу, і турмы ў Гародні, Пінску, Берасці, Слоніме.

Яшчэ ў 1920-х ён пачаў і літаратурную дзейнасць, і ў 1939 годзе нарэшце пабачыла свет ягоная першая кніга вершаў «Жураўлiным шляхам», на вокладцы якой быў пазначаны псеўданім Хмара. Пад гэтым псеўданімам ён увайшоў не толькі ў беларускую літаратуру, але і ў грамадскую прастору беларускай паваеннай эміграцыі.

У 1949 годзе ён апынуўся ў Канадзе, дзе ад самага пачатку развіў актыўную дзейнасць. На той момант ён быў ужо вядомы як стваральнік Літаратурнай сустані «Баявая Ускалось» і выдавец аднайменнага часопіса, аўтар некалькіх, выдадзеных у паваеннай Нямеччыне і даволі папулярных у беларускім эміграцыйным асяроддзі кніг (прыкладам, «Аб багох крывіцкіх сказы», што зведала некалькі выданняў).

Але ці не найбольш вядомым Сяргей Хмара стаў як непрымірымы змагар з палітычным расколам. Ён не прымаў падзелу беларусаў на прыхільнікаў Рады БНР або Беларускай Цэнтральнай Рады. Не прымаў і жорстка крытыкаваў палітычных лідараў, чым нажыў сабе ворагаў у тым ліку і ў беларускай грамадзе ў Канадзе.

Газета Хмары «Беларускі голас», што выдавалася ў Канадзе ў 1952–1992 гадах, стала адным з найбольш працяглых эміграцыйных выдавецкіх праектаў. Праз сваю вострую і не заўсёды абгрунтаваную крытыку беларускіх эміграцыйных рэалій «Беларускі голас» аб'яднаў у нелюбові да сябе значную частку суродзічаў на Захадзе. І тым не менш, газета мела шмат карэспандэнтаў і дасылалася ў Аўстралію, ЗША, Вялікабрытанію, Аргенціну, Бразілію, Нямеччыну, Францыю і іншыя краіны прысутнасці беларусаў. Яе, бадай, аднаасобны выдавец Сяргей Хмара меў вялікае ліставанне з дзясяткамі беларускіх (і не толькі) дзеячаў у розных краінах. І гэтая карэспандэнцыя склала аснову ягонага архіву, перададзенага пасля смерці дзеяча ягонымі сваякамі ў Нацыянальны архіў Канады ў Атаве.

## Магдалена

Архіў Сяргея Хмары для метрапольных беларусаў выглядаў чымсьці амаль міфічным. Мне вельмі хацелася, калі ўжо я апынулася ў Нацыянальным архіве Канады, пабачыць гэтыя матэрыялы. Аднак для атрымання доступу да такіх прыцягальных папераў спатрэбілася некалькі тыдняў і актыўныя перамовы з архівістамі, а апошніх, адпаведна, з Магдаленай Зіняк — малодшай дачкой Сяргея Хмары і распараджальніцай ягонага архіву.

У выніку я не толькі атрымала магчымасць папрацаваць з матэрыяламі легендарнага фонду, дзе, што праўда, аказалася не так шмат сенсацыйнага, як чакалася, але і пазнаёмілася з самой Магдаленай. Жанчына выказала цікавасць да маёй даследчай працы і разам з дазволам на прагляд папераў прапанавала спаткацца. У подпісе электроннага ліста была пазначана яе пасада: «Нацыянальны віцэ-прэзідэнт OMNI-Television».

Тэлекампанія OMNI, у кіраўніцтва якой уваходзіць Магдалена Зіняк, — гэта мультыкультурнае тэлебачанне, дзе транслююцца праграмы ў розных мовах і для прадстаўнікоў розных этнічных групаў, што жывуць у Канадзе. Яна мае пяць станцый у Таронта, Атаве, Калгары, Ванкуверы і Эдмантане, і вяшчае на 40 мовах. На жаль, беларуская ў гэты спіс не ўваходзіць. На пытанне «чаму?» Магдалена пры нашым першым спатканні ў Атаве адказала, што паколькі тэлекампанія камерцыйная, то ўсе нацыянальныя групы, зацікаўленыя ва ўласных перадачах, мусяць плаціць за іх, а беларуская грамада, відаць, занадта малая, каб утрымліваць сваю праграму, таму што такой ініцыятывы не выказвала.

Беларусам складана параўнацца з украінцамі, якіх у Канадзе каля мільёну, палякамі, рускімі і іншымі значна больш колькаснымі на эміграцыі нацыямі. Аднак гэта не значыць, што пра беларусаў на тэлеканале не ведаюць. Сама Магдалена, якая нядрэнна для чалавека, народжанага па-за межамі Беларусі, размаўляе пабеларуску, паўсюль пазіцыянуе сябе менавіта як беларуска. І яе падначаленыя, і асобы, з якімі яна сутыкаецца па сваіх прафесійных і іншых справах, у тым ліку і на найвышэйшым узроўні, ведаюць, што яна беларуска. Ад самага пачатку сваёй кар'еры журналістка, як і бацька, мела на мэце паўсюль рэпрэзентаваць Беларусь. Час ад часу Магдалена піша артыкулы, прысвечаныя беларускай журналістыцы і наогул беларусам у Канадзе для розных выданняў.

Адным з першых маіх пытанняў у гутарцы было, чаму абмежаваны доступ да архіву. Перагледзеўшы паперы, я сама не змагла адказаць на яго, таму было вельмі цікава даведацца пра гэта ад самой ініцыятаркі. Магдалена адказала проста: улічваючы ў пэўнай ступені «дысідэнцкі» статус Сяргея Хмары ў дачыненні да Беларусі, а таксама негатыўнае стаўленне ягонай дачкі да сучасных беларускіх уладаў, яна не хацела, каб нейкія афіцыйныя асобы корпаліся ў паперах яе бацькі. Толькі і ўсяго.

Магдалена шмат распавядала пра бацьку, пра ягонае настойлівае жаданне, каб пасля смерці паперы трапілі ў Нацыянальны архіў Канады і захаваліся для гісторыі. Яна ўсё зрабіла, як ён жадаў. Гэтая, безумоўна, неардынарная жанчына, з шэрагу тых, што на Захадзе называюць self-made person, вельмі ўдзячная свайму бацьку за выхаванне моцнага характару, без якога яна б не дасягнула столькі ў жыцці.

## Шлях наверх

Магдалена нарадзілася, калі бацьку было 52 гады і, паводле яе словаў, Сяргей Хмара быў вельмі патрабавальны да сваёй малодшай дачкі, яна павінна была ўсё ведаць і ўсё ўмець, выхоўвалася смелай і настойлівай. У хаце заўсёды былі дзве мовы: беларуская ад бацькі і руская ад маці. Гэтаксама па чарзе яна хадзіла ў царквы: з маці ў рускую, з бацькам у беларускую.

Сяргей Хмара ў Канадзе ад пачатку, як і іншыя эмігранты, мусіў зарабляць на жыццё на некваліфікаванай працы, аднак большасць свайго вольнага часу прысвячаў газеце. «Беларускі голас» быў справай ягонага жыцця. І ад малых гадоў Магдалена дапамагала бацьку. Яшчэ зусім малую, ён браў яе з сабою ў вазку ў друкарню, калі здаваў газету, і ўсім расказваў, што яна будзе журналісткай. Напрарочыў.

Спачатку Магдалена проста дапамагала бацьку рыхтаваць матэрыялы для газеты, а ад 1975 года была сталым супрацоўнікам рэдакцыі і разам з Хмарам удзельнічала ў розных культурных мерапрыемствах, дзе прадстаўляла і «Беларускі голас», і Беларусь. У той час дзяўчына ўжо вучылася ў Таронтаўскім універсітэце і сапраўды абрала сваёй прафесіяй журналістыку, у якой аддала перавагу тэлебачанню.

Сяргей Хмара шмат кантактаваў з рознымі ўрадавымі і парламенцкімі дзеячамі, у тым ліку і ў пошуках фінансавання для газеты (у сямейным архіве ёсць і фотаздымкі з канадскімі прэм'ер-міністрамі). Сродкамі на выданне дапамагалі і парафіяне царквы Св. Ефрасінні Полацкай у Таронта. Аднак багата грошай ішло з уласнага бюджэту сям'і Зінякоў. Магдалена ўзгадвала, як аддавала і частку сваіх першых заробкаў на бацькаву газету.

1950–1960-я гады ў Канадзе былі складаным часам. Улады і грамадства даволі насцярожана ставіліся да эмігрантаў і іх ініцыятываў, баючыся «камуністычных прывідаў». І ў гэты час Сяргей Хмара стаў рэалізоўваць другую вялікую справу свайго жыцця, у якой таксама добрай памочніцай стала дачка Магдалена, гуртаванне этнічных журналістаў. Менавіта ён стаў адным з заснавальнікаў Клубу канадскіх этнічных журналістаў і пісьменнікаў, які потым пертварыўся ў Канадскую асацыяцыю этнічных медыяў. Яна аб'яднала сотні працаўнікоў газет, радыё, тэлебачання розных нацыянальнасцей, якія хацелі прадстаўляць свае краіны, пашыраць інфармацыю пра іх. Доўгія гады (да сваёй смерці) Марыян Зіняк быў выканаўчым дырэктарам клубу, а сёння старшынёй асацыяцыі з'яўляецца ягоная дачка.

Магдалена пачынала сваю кар'еру на тэлебачанні ў 1979 годзе ад самага заснавання першай канадскай шматкультурнай тэлевізіі — так званай Canada's first multilingual television (CFMT). У 1980-м яна атрымала пасаду прадусара на Дзясятым канале кабельнага тэлебачання вядомай канадскай кампаніі «Роджэрс». Але ў 1987 годзе Магдалена перайшла зноў у CFMT (або OMNI-1, разлічаную на этнічныя групы з Еўропы і Лацінскай Амерыкі), якая цяпер таксама належала «Роджэрсу». Тут цягам наступных больш як дзесяці гадоў жанчына працавала на пасадах менэджэра, дырэктара, выканаўчага прадусара, віцэ-прэзідэнта. Ужо на пачатку XXI стагоддзя, калі з'явілася яшчэ і тэлевізія OMNI-2 (для эмігрантаў з Азіі і Афрыкі), яе запрасілі ў кіраўніцтва ўсёй OMNI-Television на пасаду віцэ-прэзідэнта.

Імклівая кар'ера суправаджалася вялікай працай у галіне канадскага шматкультуралізму, пашырэннем сеткі этнічных праграм і колькасці станцый, за што Магдалена Зіняк была неаднаразова ўзнагароджаная на розных узроўнях. У яе скарбонцы ганараванні ад нацыянальных арганізацый: латышскай, эстонскай, рускай, вугорскай, македонскай і іншых, а таксама найвышэйшая ўзнагарода правінцыі Антарыё — Ордэн Антарыё (2001) ды найвышэйшая дзяржаўная ўзнагарода — Ордэн Канады (2009).

У сучаснай канадыйскай журналістыцы беларуска Магдалена Зіняк на першых ролях. Побач з афіцыйнай працай яна «на грамадскіх пачатках» удзельнічае ў шэрагу розных арганізацый, у тым ліку жаночых. Як сябра арганізацыі, што займаецца праблемамі свабоды слова, Магдалена ведае, што Беларусь сёння сярод лідараў у свеце па колькасці зняволеных за прафесійную дзейнасць журналістаў.

Тры гады таму дачка Хмары наведвала бацькаву радзіму. Яна пабывала ў Слоніме, Сынкавічах, Зэльве, Гародні. Ехала з перасцярогай, як прыме краіна дачку дзеяча, што сядзеў амаль пры ўсіх уладах, пры якіх жыў. Але паездкай засталася задаволенай: і месцы, і людзі — усё сваё. Каб жа толькі яшчэ сапраўднай свабоды бацькавай краіне!

СПАДЧЫНА

# ГОМЕЛЬ ЗНІШЧАЮЦЬ

Зміцер СУЛІМЕНКА

**Шмат хто пазнае горад Гомель па палацы Румянцавых-Паскевічаў і гарадскому парку імя Луначарскага. Хтосьці — па праваслаўнай царкве імя Пятра і Паўла, пабудаванай на пачатку XIX стагоддзя. І мала хто ведае пра непаўторную драўляную спадчыну Гомеля, якая знаходзіцца сёння пад пагрозай.**





Знішчэнне пачалося ўжо даўно. Па афіцыйнай версіі — горад быў разбураны ў вайну немцамі. Дадалі разбурэння і шматлікія бамбардзіроўкі савецкай авіяцыі падчас вызвалення Гомеля. Пасля вайны горад адбудоўваўся з дапамогай нямецкіх палонных, якія спрычыніліся да аднаўлення дарэвалюцыйнай часткі горада. Але адначасова шмат што і разбуралася. Былі знішчаны, у прыватнасці, некалькі праваслаўных храмаў і старыя могілкі. На месцы праваслаўных могілак сёння размяшчаецца сквер Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, а на месцы двух габрэйскіх могілак чамусьці былі пабудаваны два стадыёна. У выніку Гомель вельмі страціў у сваім гістарычным выглядзе.

Горад страчвае свой воблік і ў часы незалежнай Беларусі. У 1996 годзе быў дашчэнту знішчаны дом Крушэўскіх-Лісоўскіх, вядомы гамяльчанам пад назвай «Паляўнічы домік», гарадскі асабняк XIX стагоддзя ў стылі класіцызму. Па інфармацыі з Упраўлення архітэктуры гарвыканкама, будынак не падлягаў аднаўленню, і таму яго танней было знесці, а замест адбудаваць яго дакладную копію. Па сутнасці — муляж. Зусім нядаўна былі знішчаны дзве ўнікальныя цагляныя сядзібы канца XIX — пачатку XX стагоддзяў па вуліцы Пушкіна. На іх месцы зараз вядзецца будаўніцтва «шматфункцыянальнага комплексу». Быццам бы няма іншых месцаў для такіх установ.

У пачатку XXI стагоддзя пачаўся знос драўляных дамоў сядзібнага тыпу канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Гэты працэс працягваецца і сёння. Пад пагрозай знішчэння цэлы раён старых забудоў у раёне вуліц Парыжскай камуны, Валатаўскай, К.Маркса, Арцёма, Сожскай, вядомы да рэвалюцыі пад назвай Свісток. Такую назву ён, хутчэй за ўсё, атрымаў ад пражываючых у ім паліцэйскіх чыноў. Пасля вайны раён пачаў забудоўвацца шматпавярховымі дамамі, але і зараз яшчэ захаваліся цэлыя кварталы прыватнага сектару.

Калі трапляеш на гэтыя вуліцы, то ствараецца адчуванне, што апынуўся ў пачатку XX стагоддзя. І хоць гэтыя дамы афіцыйна не з'яўляюцца помнікамі архітэктуры, але яны фармуюць непаўторны вобраз гораду і ўяўляюць для яго вялікую гістарычную каштоўнасць. Фасады драўляных дамоў аформлены непаўторным дэкорам, характэрным для рэгіёна Усходняга Палесся. Мы можам знайсці шматлікія ўзоры драўлянай разьбы, разнастайныя ўпрыгожванні вокнаў, карнізаў, ганкаў, уваходных брамаў. Слупавыя ганкі аздоблены каванымі ці драўлянымі дэкаратыўнымі казыркамі. Часткова захавалася клінкерная кладка маставой 1920–1930-х гадоў. Паколькі дамы не ахоўваюцца дзяржавай як помнікі архітэктуры, гаспадары вольныя рабіць з імі што заўгодна: дадаваць усялякія прыбудовы, абкладваць цэглай, абшываюць сайдынгам. Так дамы губляюць свой першасны выгляд і, натуральна, сваю непаўторнасць. Але самае прыкрае, што гэтыя раён трапіў пад знос і пакрысе ўнікальныя драўляныя дамы адзін за адным ператвараюцца ў груды будаўнічага смецця.

Згодна з новым генеральным планам развіцця горада Гомеля, да 2015 года раён так званага Свістка павінен быць знесены. Матывацыя чыноўнікаў зразумелая: хутка і без асаблівых намаганняў атрымаць прыбытак, бо квадратны метр жылля ў цэнтры горада каштуе значна больш, чым у іншым раёне. І іх ужо не турбуе будучыня. Не хвалюе пытанне, ці змогуць нашы дзеці ўбачыць, як выглядаў горад 100–150 гадоў таму… І нават не хвалюе прагматычны клопат, а ці нельга зрабіць гэты раён прывабным для сваіх ды замежных турыстаў, для патэнцыйных інвестараў і атрымаць, адпаведна, камерцыйную выгоду? Не толькі тут і адразу, але і на дзясяткі гадоў наперад.

Настаўнікі, гісторыкі, архітэктары і проста неабыякавыя людзі б'юць трывогу. Вось як пра гэта разважае настаўнік гісторыі Наталля Маркевіч: «Гэты раён варта было б захаваць як музей пад адкрытым небам: музей жыллёвай архітэктуры, рамёстваў (разьбы, кавальства). Дамы знаходзяцца ў добрым стане, нягледзячы на тое, што ім больш за сто гадоў. У іх можна б было размясціць музейныя экспазіцыі, мастацкія гурткі ці майстэрні, дзе можна было б навучаць людзей разнастайным рамёствам. Такога кшталту музей для Гомельшчыны быў бы цалкам унікальным, бо апроч палаца Паскевіча ў Гомелі нічога адметнага ў архітэктуры практычна няма. Справа ў тым, што наш горад яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя быў заштатным, павятовым з пераважна аднапавярховай забудовай, у адрозненні, скажам, ад губернскага на той час Магілёва. Музей пад адкрытым небам у цэнтры Гомеля быў бы запатрабаваны і замежнымі турыстамі, бо палацаў у іх багата, а вось драўляны дэкор — цалкам унікальная для іх з'ява».

Цягам апошняга года актывісты грамадскай арганізацыі ТБМ ладзяць пешыя экскурсіі па драўлянай забудове па маршруце вуліц Парыжскай камуна, Арцёма, Валатаўскай, Карла Маркса. Дзясяткі чалавек — пераважна гомельская моладзь — даведаліся пра драўляны дэкор. «Мы жывем у Гомелі, штодня ходзім паўз драўляныя дамы і не ўсведамляем, якую каштоўнасць яны ўяўляюць. Таму адна з мэтаў нашых экскурсій — гэта распавесці пра ўнікальнасць драўлянага дэкору Гомельшчыны і, адпаведна, данесці думку пра неабходнасць ягонага захавання», — распавядае адзін з арганізатараў экскурсій Яўген Якавенка.

Намаганні гісторыкаў ды грамадскасці не марныя, бо ўлада ўсё ж такі іх пачула. Напрыканцы 2010 года адбылося пасяджэнне гарадской каардынацыйнай Рады па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей. Упершыню за адным сталом сабраліся чыноўнікі, архітэктары ды навукоўцы, каб абмеркаваць спосабы ўратавання драўлянай забудовы не толькі цэнтра, але і горада ў цэлым.

## СУЧАСНЫЯ АНЕКДОТЫ

***

Арганізацыя Аль-Каіда абвяшчае набор у тэрарыстычныя групы. Беларускія токары і электрыкі, асабліва з пяцёркамі па школьнай хіміі, прымаюцца без чаргі.

***

**Стабільнасць. Першая стадыя**

У беларускай рэстарацыі:

— Скажыце, а што гэта за комплекс «стабільнасць»?

— О, гэта нашы адмысловыя стравы. Усе элементы збалансаваныя. Калі вы замаўляеце гарбату з цукрам, то смажаніны не будзе. А калі атрымаеце нешта, што гатуецца на алеі, то піце чай без салодкага.

**Стабільнасць. Другая стадыя**

«Смажаніна і гарбата толькі для кліентаў, якія прыносяць свой алей і цукар!»

**Стабільнасць. Трэцяя стадыя**

«Абслугоўваюцца толькі кліенты са сваімі харчамі!»

**Стабільнасць. Апошняя стадыя**

«Рэстарацыя прапануе кліентам аналітычныя праграмы беларускай тэлевізіі, дзе ёсць кадры з ежай, заснятай за мяжой!»

***

— Чым долар, куплены ў Беларусі, адрозніваецца ад такога ж долару ў Злучаных Штатах?

— На беларускім — мазгі месціча, затаптанага ля абменніку.

***

Пасадзіў Бураціна залаты — і вырасла дрэва з залатымі манетамі. Набраў іх Бураціна, прыйшоў да таты Карлы… І атрымаў па шыі: «Лепей бы пасадзіў грэчку!»

***

Дыктатура ў трох этапах:

1) «Вам не пашанцавала з кіраўніцтвам. Цяпер кіраваць мушу я!»

2) «Мудры народ варты свайго наймудрэйшага кіраўніка»

3) «Які гнюсны народ, не здольны ацаніць шчасця майго кіраўніцтва!»

АНОНС

## ТРЭЦЯЯ ПРЭМ'ЕРА КУРЭЙЧЫКА

Андрэй РАСІНСКІ

**4 чэрвеня на тэлеканале «РТР-Беларусь» — прэм'ера расійска-французскай стужкі «Я дачакаюся» ад сцэнарыста Андрэя Курэйчыка. Гісторыя францужанкі, якая трапіла ў Савецкі Саюз, беларускае кіначынавенства не зацікавіла.**

Сцэнарыст Андрэй Курэйчык сёлета прадстаўляе трэцюю прэм'еру. Дзве першыя стужкі «Ёлкі» і паўтор «Службовага раману» былі лёгкімі расійскімі камедыямі. Карціна «Я дачакаюся» — сур'ёзная драма, пастаўленая паводле п'есы Курэйчыка «Тры Жызэлі».

У аснове фільму — гісторыя, якую расказала Курэйчыку кіраўніца тэатру «Сучаснік» Галіна Воўчак. Францужанка Жызэль Купес жыла ў Парыжы да вайны, але закахалася ў рускага салдата і паехала за ім у Савецкі Саюз. Там яе чакалі цяжкія выпрабаванні, якія Жызэль прайшла з годнасцю. «Уласна, пра гэта і кіно, — падкрэслівае Курэйчык. — Як захаваць годнасць у вусцішных, пачварных умовах».

Сцэнарыст прапаноўваў стужку «Беларусьфільму», але прапанова была адрынутая. «Тады я прадаў сцэнар Аляксандру Алейнікаву, аднаму з прадзюсараў фільму «Любошчы-мілошчы», а ён ужо знайшоў для яго кампанію і рэжысёра», — распавядае Курэйчык. Музыку для інтэрнацыянальнай стужкі напісаў беларускі кампазітар Сяргей Ждановіч.

П'еса «Тры Жызэлі», па якой зроблены фільм, у 2004 годзе выйграла міжнародны драматургічны конкурс «Еўразія». На мінскай сцэне яна была пастаўленая ў Новым драматычным тэатры Аляксандрам Гарцуевым.

«Гэта першая сапраўдная экранізацыя маёй п'есы, — кажа пра стужку Андрэй Курэйчык, які на сёння адзін з сама паспяховых расійскіх сцэнарыстаў. — На жаль, я не маю пакуль магчымасці рэалізаваць сябе ў беларускім кінематографе».

Трохгадзінны фільм «Я дачакаюся» разбіты на серыі па 45 хвілінаў. Першая серыя — а 20.45 з паўторам раніцай.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 605

Падпісана да друку 3.06.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.